Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№211 (28575)

1 ЛІСТАПАДА 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
стар. 9–16



**Агляд беларускага тыдня моды**
СТАР. 4



**Новыя вакансіі і новыя магчымасці**
МС



**Адчуць сябе гаспадаром двара**
МС

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір ПАТУПЧЫК, міністр энергетыкі:**

*«Нам вельмі важна збалансаваць дзейнасць нашых энерга- і газазабеспячальных арганізацый. З аднаго боку, трэба забяспечыць прымальныя тарыфы для насельніцтва, з другога — канкурэнтаздольныя тарыфы для эканомікі ва ўмовах перакрыжаванага субсідавання і сённяшніх цэн на газ. Мы павінны паслядоўна рухацца па шляху зніжэння тарыфаў для рэальнага сектара эканомікі, і гэты працэс не будзе спыняцца ні ў 2018-м, ні ў 2019-м».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.11.2017 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9741 ▲ |
| Еўра | 2,2970 ▲ |
| Рас. руб. | 0,0339 ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0734 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ТЭОРЫЯ І ПРАКТЫКА




Уладзімір СОЙМІН — тэхнік-тэхнолаг і майстар вытворчага навучання Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта (БНТУ) — трэці год вучыць студэнтаў (па сутнасці, сваіх равеснікаў) — будучых інжынераў-тэхнолагаў майстэрству зваршчыка. На гэтым здымку малады майстар выкладае азы розных відаў механічнай зваркі студэнтам-першакурснікам дзённага аддзялення механіка-тэхнічнага факультэта ўніверсітэта. Сам Уладзімір — студэнт-завочнік гэтага ж факультэта. Пасля размеркавання ў каледжы ён прыйшоў сюды на працу, але вырашыў адначасова працягваць вучобу. Цяпер ён — самы малады спецыяліст сярод майстроў вытворчага навучання.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

■ Ва ўрадзе

## Паспеем за прамысловай рэвалюцыяй

**Праект стратэгіі развіцця навукі і тэхналогій на 2018—2040 гады, а таксама выкарыстанне сродкаў інавацыйных фондаў абмеркавалі на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў. Як адзначыў прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ, распрацоўка стратэгіі стане адным з ключавых мерапрыемстваў Года навукі. Паводле задумкі Нацыянальнай акадэміі навук, стратэгія павінна стаць дакументам, які вызначае асноўныя прыярытэты навукова-тэхналагічнага развіцця краіны на доўгатэрміновую перспектыву.**

«Таму папрашу ўсіх ставіцца да яго ўважліва. Гэта не нейкая абстракцыя або вельмі аддаленая перспектыва. Гэтае пытанне сверхактуальнае», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў.

Па словах **старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзіміра ГУСАКОВА,** пры падрыхтоўцы праекта дакумента стратэгіі НАН выкарыстала найлепшы сусветны вопыт. «Навука развіваецца хуткімі тэмпамі, з'яўляюцца новыя распрацоўкі ў IT-сферы, галінах штучнага інтэлекту, робататэхнікі. Наша краіна не павінна адставаць у гэтым кірунку. У нас ёсць добры патэнцыял, высокакваліфікаваныя кадры для развіцця навукі», — лічыць Уладзімір Гусакоў.

СТАР. 2

## ЧЫТАЙ «ЗВЯЗДУ» — ПРАЧЫТАЕШ УСЁ

**Не сакрэт, што звяздоўцы любяць сваіх чытачоў, людзей адметных, цікавых і шчырых. А колькі захапляльных гісторый ды тэм яны падказваюць нам, карэспандэнтам... Аддзячыць нашым шаноўным падпісчыкам і заўзятарам мы можам добрым словам ды падарункамі. У рэкламнай гульні сярод падпісчыкаў на "Звязду" на чацвёрты квартал мы разыгралі шэсць электрычных вяндлярняў. Адну з іх нашы карэспандэнты самі павезлі на Гродзеншчыну.**



У Гродзенскай вобласці гэты патрэбны ў гаспадарцы апарат выйграла **Ірына КРОТАВА, галоўны бухгалтар ДРБУ №158, філіяла КУП «Гроднааблдарбуд» з Карэліч.** Такім чынам, на выхадных у нашай падпісчыцы з больш як 25-гадовым стажам атрымалася двайное свята: уручэнне прыза ад «Звязды» і Дзень дарожніка і аўтамабіліста. Якраз перад нашай сустрэчай Ірыне Іванаўне ўручылі на прадпрыемстве грамату і прэмію.

— Яшчэ падчас першага розыгрышу — больш за 25 гадоў таму назад, я тады выпісвала газету яшчэ толькі два гады — я выйграла ў «Звяздзе» фотаапарат «Зеніт». Ён і дагэтуль у нас ёсць і спраўны. Шмат ім здымалі. Шкада, што зараз плёнку да яго цяжка знайсці, — расказвае жанчына.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ КАШТОЎНЫЯ ПРЫЗЫ!

Пачалася падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

## Парламенцкі дзённік

# З РОЗНЫХ БАКОЎ

## У Палаце прадстаўнікоў абмеркавалі ўкараненне айчынных інавацый

**Яны іграюць выключную ролю ў тым, каб прадукцыя прадпрыемства была канкурэнтаздольнай на знешніх рынках. Учора гэта стала тэмай круглага стала ў ніжняй палаце парламента.**

**Андрэй РЫБАК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі,** расказаў журналістам, што падчас выязных пасяджэнняў дэпутаты часта наведваюць розныя прамысловыя прадпрыемствы:

— Мы выразна разумеем, што толькі высокі ўзровень інавацыйнай прадукцыі ў агульным выпуску рэалізаванай прадукцыі — гэта залог іх развіцця. Калі мы кантактуем з кіраўніцтвам прадпрыемства, з кіраўніцтвам нашых навуковых калаў, то бачым, што ёсць пэўнае непаразуменне з абодвух бакоў.

Для таго каб прамыслоўцы і вучоныя маглі напрамую абмеркаваць хвалюючыя іх пытанні, профільная камісія ніжняй палаты арганізавала круглы стол «Праблемы ўкаранення айчынных інавацый прадпрыемствамі прамысловасці краіны».

— На базе гэтага мы сфармулюем пэўныя рэкамендацыі ўраду і пэўныя прапановы пры фарміраванні змяненняў у заканадаўчую базу, — паведаміў парламентарый.

**Сяргей ЧЫЖЫК, першы намеснік старшыні Прэзідыума НАН Беларусі,** упэўнены: для таго, каб інавацыі ў вытворчасці прыжываліся, рух павінен быць узаемны.

— І калі сёння прадпрыемства хоча быць на плаве, хоча быць канкурэнтным, то яно будзе рухацца ў гэтым кірунку, — адзначыў Сяргей Чыжык. — Трэба разумець, што гэта цягне за сабой укладанне сродкаў, абнаўленне калектыву. Прывяду ў прыклад кітайскую кампанію HUAWEI, якая сёння займае сур'ёзныя пазіцыі на сусветным рынку смартфонаў. Гэта вельмі канкурэнтная сфера, і кампанія пры велізарным абароце 10—15% укладвае ў інавацыі.

У круглым стале прынялі ўдзел прадстаўнікі шэрагу вядучых айчынных прадпрыемстваў. **Алена ПЕРАЦЯГІНА, намеснік генеральнага дырэктара па тэхналогіі і якасці Беларускага металургічнага завода,** расказала, чаго не хапае яе прадпрыемству ў плане супрацоўніцтва з навукоўцамі. У першую чаргу — аператыўнасці дзяржаўных органаў, якія адказваюць за фінансаванне інавацыйных праектаў на прамысловасці.

— У мінулым годзе была ідэя атрымаць грошы (з бюджэту. — **Аўт.**) на даследчую работу па вытворчасці падшыпнікавай сталі, — прывяла прыклад прадстаўнік прадпрыемства. — У снежні мінулага года мы абаранілі яе ў Міністэрстве прамысловасці, пасля яна пайшла далей. У выніку прайшло месяцаў восем, і нам паведамляюць, што работа не прымаецца і яе неабходна дапрацоўваць. Такім чынам, тэрміны разгляду — вельмі доўгія. У нас няма магчымасці сядзець і чакаць, калі, напрыклад, усё гэта будзе ўхвалена і нам выдзеляць грошы. Мы павінны выконваць вытворчую праграму, мы абавязаны распрацоўваць новыя віды прадукцыі. У выніку мы самі распрацавалі неабходную тэхналогію і не сталі прасіць грошай з бюджэту. Сёння дадзеную прадукцыю мы пастаўляем еўрапейскаму спажыўцу.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# Паспеем за прамысловай рэвалюцыяй

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Стратэгія прадугледжвае мерапрыемствы для трох этапаў: з 2018 па 2020 год, з 2020 па 2030-ы і з 2030 па 2040-ы. У дакуменце будуць прапісаны арыенціры і індыкатары развіцця для кожнага з іх. Чакаецца, што фінансаванне навукі будзе таксама павялічвацца. Адным з важных мерапрыемстваў стане падрыхтоўка да новай прамысловай рэвалюцыі — «Industry 4.0». Уладзімір Гусакоў адзначыў, што гэты трэнд грунтуецца на інфарматызацыі і лічбавай эканоміцы, але пры ўкараненні новых тэхналогій трэба будзе ўлічыць і спецыфіку беларускай вытворчасці.

На пасяджэнні Прэзідыума Саўміна таксама абмеркавалі работу Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях і іншых рэспубліканскіх і мясцовых органаў дзяржкіравання, якія выкарыстоўваюць сродкі інавацыйных фондаў у 2017 годзе. Фарміраваўся план па выдаткаванні рэсурсаў на наступны год.

Як адзначыў Андрэй Кабякоў, вынікі працы за 2013—2015 гады паказалі, што трэба ўдасканальваць механізмы фарміравання і выкарыстання сродкаў інавацыйных фондаў. Для гэтага ўжылі новы падыход, накіраваны на комплексны пераход ад галіновага выкарыстання гэтых сродкаў да агульнадзяржаўнага. «У 2017 годзе ў структуры выдаткаў рэспубліканскага цэнтралізаванага інавацыйнага фонду ўжо забяспечаны істотны рост аб'ёмаў сродкаў, што накіроўваюцца на фінансаванне навукова-даследчых, доследна-канструктарскіх і доследна-тэхналагічных работ, у агульным аб'ёме рэспубліканскіх інавацыйных фондаў — з 29% у 2015 годзе да 40% сёлета», — паведаміў прэм'ер-міністр.

Пры гэтым па асобных распарадчыках Андрэй Кабякоў лічыць асваенне сродкаў за 9 месяцаў гэтага года вельмі нізкім. Ён таксама падняў пытанне аб магчымасці перадаць некаторыя сродкі для больш эфектыўнага іх выкарыстання, у першую чаргу ў рамках Дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Пентагон дапусціў магчымасць нанясення прэвентыўнага ядзернага ўдару без дазволу Кангрэса

Кіраўнік Пентагона Джэймс Мэтціс прызнаўся, што ўяўляе сітуацыю, у якой амерыканскі прэзідэнт Дональд Трамп можа аддаць загад аб нанясенні прэвентыўнага ядзернага ўдару без дазволу Кангрэса. Адпаведную заяву ён зрабіў, выступаючы на слуханнях, прысвечаных прымяненню за мяжой ваеннай сілы Злучанымі Штатамі Амерыкі, паведамляе ТАСС.

«Калі б мы ўбачылі, што якая-небудзь краіна рыхтуецца да нанясення ядзернага ўдару па ЗША і што гэта непазбежна, то я магу ўявіць сабе такую сітуацыю. Гэта не адзіны сродак у нашым інструментарыі. Я лічу, што кантроль з боку Кангрэса не варта прыраўноўваць да аператыўнага кіравання», — сказаў Джэймс Мэтціс.

Кіраўнік Пентагона падкрэсліў, што гаварыў пра нанясенне прэвентыўнага ўдару без кансультацый з Кангрэсам толькі ў выпадку «непазбежнага ўдару» па ЗША і толькі, «калі гэта адзіны шлях спыніць яго».

### Гвалтам выдадзеная замуж пакістанка атруціла свайго мужа і яшчэ 14 чалавек

Паліцыя Пакістана арыштавала жанчыну, якая з дапамогай атручанага малака забіла свайго мужа і яшчэ 14 чалавек у правінцыі Пенджаб на паўночным усходзе краіны, паведамляюць пакістанскія СМІ.

Паводле іх інфармацыі, 21-гадовую Асію Бібі сілай выдалі замуж некалькі дзён таму за Амджада Лашары, хоць яна была закаханая ў іншага маладога чалавека. Тады жанчына разам са сваім каханкам спланавалі забойства яе мужа.

Бібі вырашыла дадаць яд у малако, аднак, калі яна прынесла мужу шклянку, ён адмовіўся ад напою. Тады яе маці, не ведаючы, што ў шклянцы з малаком знаходзіцца яд, выкарыстала яго пры гатаванні дамашняга ёгурту і масла, якімі потым частавалі ўсю сям'ю.

У выніку атручвання прадукты ўжылі 27 чалавек, 15 з іх памерлі, у тым ліку і муж Бібі. Астатнія шпіталізаваны. Якія менавіта яд выкарыстала жанчына, не ўдакладняецца.

Бібі прызнала сваю віну і паведаміла паліцыі, што сама дадала яд у малако. Разам з ёй затрымалі яе каханага. Якое пакаранне ім можа пагражаць, не паведамляецца.

### Экс-кіраўнік Каталоніі адправіўся ў Брусель па параду і, магчыма, прытулак



Былы кіраўнік аўтаномнага ўрада Каталоніі Карлес Пучдэмон пасля адхілення Мадрыдам ад пасады адправіўся ў Брусель для атрымання юрыдычнай дапамогі і, магчыма, палітычнага прытулку. Пра гэта паведамілі бельгійскія СМІ. У той жа час урадавыя структуры падкрэсліваюць, што ніякіх фармальных запрашэнняў яму не накіроўвалі, і адмаўляюцца афіцыйна каментаваць факт яго прыбыцця.

«Мы не можам пацвердзіць або зняпраўдзіць прыбыццё Карлеса Пучдэмона, але мы можам дакладна сказаць, што ён не атрымліваў афіцыйных запрашэнняў наведаць Брусель», — сказаў ТАСС прадстаўнік бельгійскай дыпламатычнай крыніцы. У канцылярыі прэм'ер-міністра Бельгіі Шарля Мішэля адмовіліся ад любых каментарыяў па гэтай тэме.

У панядзелак стала вядома, што пракуратура Іспаніі падала два іскі ў Вярхоўны суд і Нацыянальную судовую калегію каралеўства супраць палітыкаў, адказных за абвяшчэнне незалежнасці Каталоніі. Супраць членаў адхіленага Мадрыдам урада рэгіёна і шэрагу парламентарыяў Каталоніі выстаўлены іскі за бунт, мяцеж і растрату. Максімальны тэрмін турэмнага зняволення па гэтых артыкулах у Іспаніі можа дасягаць 30 гадоў.

## Меркаванне



# ЧАМУ ЛЮКСЕМБУРГ?

**У канцы мінулага тыдня ў Люксембургу з вялікай колькасцю наведвальнікаў прайшоў Беларуска-еўрапейскі інвестыцыйны форум «Belarus. Invest in tomorrow». Урадавая і дзелавая дэлегацыі з Беларусі, прычым на вельмі сур'ёзным узроўні, прымалі ўдзел у мерапрыемстве. Нямногія грамадзяне нашай краіны былі ў Люксембургу або валодаюць аб ім дастатковай інфармацыяй. Што ж уяўляе сабой Люксембург і чаму мы палічылі для сябе выгадным правядзенне такога мерапрыемства?**

Люксембург здаецца вельмі невялікім па тэрыторыі, якая складае крыху больш за дзве з паловай тысячы квадратных кіламетраў. Зрэшты, у свеце ёсць дастаткова ўплывовыя дзяржавы, у якіх тэрыторыя і ўвогуле ўсяго чвэрць ад яе памеру, напрыклад Сінгапур. Па насельніцтве краіна з'яўляецца адной з самых невялікіх у Еўропе — яно складае 580 тысяч чалавек. У той жа самы час краіна ганарыцца статусам самай багатай ва ўсёй Еўропе, калі праводзіць падлікі па ВУП, што прыпадае на аднаго жыхара. Нават калі браць для параўнання ўвесь свет, то Люксембург саступіць па гэтым паказчыку толькі Катару, які валодае ашаламляльнымі запасамі энергарэсурсаў, што вельмі энергічна асвойваюцца.

Эканоміка Люксембурга — асобная тэма для абмеркавання. Грошы ў краіне робяцца зусім не на ніве сельскай гаспадаркі, хоць краіна і валодае 160 гектарамі ворных угоддзяў, а таксама вінаграднікамі, ураджай з якіх дазваляе выпускаць мільёны літраў віна ў год. Галоўная спецыялізацыя краіны якраз тая, што асабліва цікавая Беларусі, — фінансавая сфера. Для вызначэння якасці працы ў гэтай сферы трэба арыентавацца на індэкс глабальных фінансавых цэнтраў, які абнаўляецца кожную вясну. Той факт, што Люксембург уваходзіць у лік 22 найбуйнейшых глабальных фінансавых цэнтраў свету, гаворыць сам за сябе. У індэксе 2017 года ён займае чатырнаццатую пазіцыю ў свеце і чацвёртую — у Еўропе. Сярод еўрапейскіх канкурэнтаў яго змаглі апярэдзіць толькі такія магутныя фінансавыя цэнтры, як Лондан (1-е месца ў свеце), Цюрых (9-е месца) і Франкфурт (11-е месца). У эканоміцы Люксембурга фінансы займаюць дамінуючую ролю, складаючы 36 працэнтаў ад ВУП. Для Беларусі ўяўляе інтарэс і іншы важны напрамак развіцця эканомікі Люксембурга — інфармацыйныя тэхналогіі. Нельга ні ў якім разе забываць і пра Арселор Мітал, найбуйнейшую ў свеце металургічную кампанію, якая базіруецца ў Люксембургу.

Як адзначае АБСЕ, эканамічныя поспехі Люксембурга звязаны з дынамічным сектарам паслуг, дружалюбнай для вядзення бізнесу атмасферай, прадказальнай і прадуманай падатковай сістэмай і адкрытасцю да прыцягнення талентаў з усяго свету ў эканоміку. Тэмпы стварэння новых працоўных месцаў у краіне ўражваюць і ствараюць выгоды не толькі для мясцовых жыхароў, але і для эмігрантаў.

Рэзюмуючы, адзначу, што эканоміка Люксембурга мае сектары, карысныя для развіцця Беларусі ці падобныя на нашу ўласную эканоміку. Арселор Мітал нагадвае нам пра наш Беларускі металургічны завод, сектар інфармацыйных тэхналогій — пра беларускі ПВТ. Банкаўская сістэма Люксембурга задае арыенціры для развіцця найбуйнейшых беларускіх банкаў.

Зусім не выпадкова гэтыя нюансы былі ўлічаны і ў рабоце Беларуска-еўрапейскага інвестыцыйнага форуму. У тым ліку ў рабоце секцыі па інфармацыйных тэхналогіях, якая выгадна пазіцыянавала Беларусь як уладальніцу аднаго з самых вялікіх ва Усходняй Еўропе экспартна арыентаванага сектара інфармацыйных тэхналогій, сканцэнтраваных галоўным чынам на плошчах ПВТ. Як адзначыў у сваім інтэрв'ю па выніках форуму прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй Кабякоў, у краіне падрыхтаваны дакумент, які надасць новае дыханне Парку высокіх тэхналогій, значна пашырыць кірункі яго развіцця, умовы функцыянавання, асучасніць нарматыўную базу з улікам апошніх дасягненняў лічбавых тэхналогій. Мы лічым, што гэта запатрабаваны напрамак, і Беларусь у плане сучасных тэхналогій аказваецца не ў хвасце цягніка, а бліжэй да лакаматыва.

У рамках форуму прайшлі і канструктыўныя перагаворы з Еўрапейскім інвестыцыйным банкам, віцэ-прэзідэнт якога Аляксандр Стуб выступіў на мерапрыемстве з дакладам. Гэтая структура валодае вялікімі актывамі, і Беларусь чакае, што неўзабаве ёю пачнуць фінансавацца маштабныя інфраструктурныя праекты на нашай тэрыторыі.

Не варта забываць і пра тое, што цяперашні кіраўнік Еўракамісіі Жан-Клод Юнкер на працягу амаль двух дзясяткаў гадоў быў прэм'ер-міністрам Люксембурга, і можна меркаваць, што ён не страціў цікавасці да навін адтуль. У палітыцы дробязяў не бывае. У гэтым плане паказальная сустрэча беларускага прэм'ер-міністра з еўракамісарам Ёханесам Ханам, на якой былі абмеркаваны прапановы аб тым, каб на экспертным узроўні пачаць адпрацоўваць падыходы да падрыхтоўкі поўнамаштабнага пагаднення «Беларусь — Еўрапейскі саюз».

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук, прафесар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь**




# Да старту зімовай Алімпіяды застаецца менш за 100 дзён

## Як рыхтуюцца нашы спартсмены і арганізатары да гэтай падзеі

**У Гульнях-2018 у карэйскім Пхёнчхане прымуць удзел каля 2,5 тысячы спартсменаў, гэта прадстаўнікі 90 краін. У 15 відах спорту з 9 па 25 лютага яны разыграюць 102 камплекты алімпійскіх узнагарод.**

Беларускія спартсмены зараз уступаюць у заключную фазу падрыхтоўкі, у якой завершыцца адбор на Гульні і канчаткова сфарміруецца склад дэлегацыі. **Намеснік міністра спорту і турызму краіны, шэф місіі беларускай каманды на XXIII зімовых Алімпійскіх гульнях Аляксандр БАРАЎЛЯ** запэўнівае, што падрыхтоўка спартсменаў праходзіць без зрываў і па вызначаным плане.

*— Адборачныя спаборніцтвы завяршацца 22 студзеня, тады мы дакладна будзем разумець, якая колькасць нашых спартсменаў прыме ўдзел у Алімпійскіх гульнях. Зараз падрыхтоўку да гэтага турніру вядуць 45 кандыдатаў па такіх відах спорту, як біятлон, фрыстайл, канькабежны спорт, шорт-трэк, гарналыжны спорт і лыжныя гонкі,* — расказвае Аляксандр Іванавіч.

З упэўненасцю можна казаць пра тое, што ў Беларусі сёння ёсць 10 алімпійскіх ліцэнзій у біятлоне (5 жаночых і 5 мужчынскіх), па рэйтынгу на Гульні праходзяць 5 фрыстайлістаў, плануецца, што 1—2 алімпійскія пропускі заваююць беларусы ў шорт-трэку, 2 у гарналыжным спорце, 4—6 у лыжных гонках і 2—4 ліцэнзіі ў канькабежным спорце. На жаль, мы не ўбачым сваіх прадстаўнікоў у фігурным катанні, сноўбордзе і хакеі.

*— Тая планка, якую паставілі нашы спартсмены ў Сочы, вельмі высокая, але сёння мы зыходзім з тых магчымасцяў спартсменаў і праведзенай імі работы, што маем на дадзены момант. Кожны будзе старацца паказаць свой найлепшы вынік. Безумоўна, калі гаварыць пра медалі, мы спадзяёмся на каманду па біятлоне і фрыстайле. Назіраем станоўчую дынаміку вынікаў у канькабежным спорце, маем шэраг вопытных спартсменаў у лыжных гонках, можа быць, сёння не гаворым пра ўзнагароды, але тое, што яны пакажуць свае максімальныя вынікі, упэўненыя,* — адзначае Аляксандр Бараўля.

*— Арганізатары са свайго боку робяць усё магчымае, каб Алімпійскія гульні прайшлі паспяхова. Аб'екты ўжо гатовыя да правядзення спаборніцтваў, заканчваецца будаўніцтва чыгуначнай веткі, якая звяжа аэрапорт Сеула з Пхёнчханам,* — расказвае **начальнік аддзела міжнародных адносін Нацыянальнага алімпійскага камітэта, намеснік шэфа місіі беларускай каманды Васіль ЮРЧЫК.** — *Вялікая ўвага арганізатарамі ўдзяляецца пытанням бяспекі, усе ведаюць, што становішча на Карэйскім паўвостраве няпростае. Нядаўна адбыўся брыфінг на гэтую тэму, у мерапрыемстве бралі ўдзел прадстаўнікі ўсіх нацыянальных алімпійскіх камітэтаў.*

Плануецца, што першая беларуская група адправіцца ў Пхёнчхан 27 студзеня, алімпійская вёска адкрыецца 1 лютага, у гэты ж дзень спартсмены і трэнеры змогуць пачаць засяленне. Гэта значыць, што апошні этап падрыхтоўкі атлеты змогуць правесці непасрэдна на саміх алімпійскіх аб'ектах.

*— Для таго каб спартсмен заваяваў алімпійскі медаль, павінны сысціся ўсе зоркі. Поспех складаецца з мноства дробязяў — арганізацыя праезду, харчаванне, адпачынак. Мы пастараемся зрабіць усё, каб спартсмен быў настроены толькі на сваё выступленне і змог паказаць найлепшы вынік,* — адзначае Васіль Юрчык.

Адно пытанне застаецца адкрытым: ці шмат беларускіх аматараў спорту змогуць дабрацца да Пхёнчхана? Гэта не населены пункт, а рэгіён, гарналыжны курорт, дзе не так шмат гатэляў, а вакол яго няма вялікіх гарадоў, таму ўзнікае вялікая праблема з месцамі пражывання для турыстаў падчас гульняў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** lobazhevich@zviazda.by

### ❍ У тэму

Урачыстая цырымонія перадачы агню зімовых Алімпійскіх гульняў 2018 года адбылася ў Афінах на стадыёне «Панацінаікас». На ёй прысутнічалі кіраўнік аргкамітэта Гульняў Лі Хі Бом, прэзідэнт Грэцыі Пракопіс Паўлопулас і кіраўнік Нацыянальнага алімпійскага камітэта Грэцыі Спірас Капралас.

*«Алімпійскія гульні ўпершыню прайшлі ў 776 годзе да нашай эры, але і ў 2017 годзе яны працягваюць заставацца наймацнейшым выражэннем дружбы, высакароднасці і справядлівасці для людзей ва ўсім свеце, — сказаў Спірас Капралас. — Алімпійскі агонь — гэта сімвал традыцый і каштоўнасцяў алімпійскага руху, сімвал міру ва ўсім свеце. Мы спадзяёмся, што эстафета алімпійскага агню пакажа, што спорт можа несці мір і рабіць свет лепшым».*

■ Будзьце ў курсе!

# Наколькі пабольшаюць пенсіі і сацыяльныя дапамогі?

**З сённяшняга дня павялічваецца бюджэт пражытковага мінімуму. З 1 лістапада да 31 студзеня яго памер у сярэднім на душу насельніцтва будзе складаць 197 рублёў 81 капейку (дагэтуль — 197 рублёў 57 капеек). У сувязі з гэтым пералічаць і выплаты, якія залежаць ад БПМ.**

Так, павысяць мінімальныя пенсіі, надбаўкі да іх, даплаты пажылым ва ўзросце 75 гадоў і старэйшым, якія атрымліваюць пенсіі ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Павялічаць дапамогі па доглядзе інваліда першай групы і асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту, дапамогі сем'ям, што выхоўваюць дзяцей. Паколькі бюджэт пражытковага мінімуму падрос на 0,1 працэнта, то і выплаты, звязаныя з ім, пабольшаюць на 0,1 працэнта.

Нагадаем, што 17 кастрычніка Прэзідэнтам быў падпісаны Указ №377, згодна з якім з лістапада павысіцца таксама працоўныя пенсіі — у сярэднім на пяць працэнтаў. Дадатковыя расходы ў сувязі з гэтым складуць 42,76 мільёна рублёў у месяц. У кожным канкрэтным выпадку памер прыбаўкі будзе залежаць ад індывідуальных параметраў стажу, велічыні заробку. Па падліках, сярэдняя пенсія складзе 315,74 рубля.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** lubneuskaya@zviazda.by

# Падаражэў гарадскі транспарт

**З 1 лістапада ў сталіцы павялічваецца тарыф на праезд у гарадскім транспарце. Адпаведнае рашэнне Мінгарвыканкама апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.**




Кошт праезду ў аўтобусах, тралейбусах, трамваях у звычайных і хуткасных рэгулярных зносінах павялічваецца да BYN 0,6 за адну паездку, у метро — да BYN 0,65, перавозкі пасажыраў і ручной паклажы на экспрэс-маршрутах устаноўлены ў памеры BYN 0,75. Павялічаны тарыфы на гарадскія перавозкі ручной паклажы: аўтобусамі, тралейбусамі, трамваямі — да BYN 0,6, у метро — да BYN 0,65. Кошт білета пры рэалізацыі кіроўцам павялічваецца на 5 капеек.

Праязныя даражэюць на 12—13 працэнтаў. Напрыклад, праязны на аўтобус-тралейбус-метро на 15 сутак — BYN 23,19; на 30 сутак — BYN 44,15; на 30 паездак (на тры віды наземнага транспарту) — BYN 16,38, на метро — BYN 17,74. Як паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс», білеты на адну паездку па ранейшых тарыфах будуць сапраўдныя на працягу 30 сутак. Дарэчы, апошні раз кошт праезду ў грамадскім транспарце Мінска павялічваўся ў снежні мінулага года. Тады падаражанне склала таксама пяць капеек.

У Мінскай і Віцебскай абласцях, а затым на Гомельшчыне і Брэстчыне кошт праезду ў гарадскім транспарце быў павышаны раней.

Фіксаваны тарыф на гарадскія перавозкі пасажыраў аўтобусамі на звычайных і хуткасных маршрутах у рэгулярных зносінах зараз складае BYN 0,50 за адну паездку (да нядаўняга часу — BYN 0,45). Гранічны максімальны тарыф на экспрэсных маршрутах у рэгулярных зносінах — BYN 0,60 за адну паездку (BYN 0,55). Фіксаваны тарыф на гарадскія перавозкі ручной паклажы складае BYN 0,50 (BYN 0,45). Кошт білета пры рэалізацыі кіроўцам таксама павялічваецца на пяць капеек.

Кошт праязнога білета шматразовага карыстання таксама павялічыўся.

# На стаянках — новыя тарыфы

**З 1 лістапада ў Мінску ўводзяцца новыя тарыфы на захоўванне транспартных сродкаў на аўтастаянках ДА «Гаражы, аўтастаянкі і паркоўкі».**

Тарыф на захоўванне матацыкла без каляскі, матаролера, мапеда, скутара, снегахода ў закрытым памяшканні на аўтастаянцы №23 устанаўліваецца з названай даты ў памеры 20 рублёў у месяц для фізічных, юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў. Вызначаны новыя тарыфы на паслугі па сезонным захоўванні шын для фізічных, юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў на аўтастаянках №23 і №89.

Таксама змяняецца кошт паслуг для юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў на адкрытых аўтастаянках, акрамя машына-месцаў пад навесамі, эстакадамі, мастамі, на аўтастаянках №№17, 21, 29, 106, 107. Адмяняецца дыферэнцыраваны тарыф выхаднога дня (нядзелі) за захаванне транспартных сродкаў фізічных, юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў на паркінгу па праспекце Незалежнасці, 3-1.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** rs@zviazda.by ■

# ЧЫТАЙ «ЗВЯЗДУ» — ПРАЧЫТАЕШ УСЁ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Цікава, што свой другі выйгрыш — мангал — яна выйграла гэтым летам. Яго з рэдакцыі забірала дачка Ірыны Іванаўны, якая жыве ў Мінску. Другая дачка — у Лідзе. Прыз даўно апрабавалі — засталіся задаволеныя. «Зяць сказаў, добрая прылада», — усміхаецца наша пераможца. Паверыць у яшчэ адну ўдачу літаральна праз пару месяцаў было цяжка, кажа яна.

— Вечарам у нядзелю, ужо дзяцей адправіла дадому, сядзела чытала артыкул пра жанчыну, якая пакінула працу ў банку, каб стаць прыёмнай мамай. А пасля выпадкова ўбачыла сваё прозвішча на суседняй старонцы. Па прафесійнай звычцы бухгалтара пачала шукаць, пра што гаворка. Адгортваю першую старонку — ох! — прыз! Я доўга не магла апрытомнець ад узрушэння, не магла паверыць, што зноў перамагла, — хвалюецца Ірына Кротава. — А дзеці мае смяюцца: «Мама, табе больш нельга гуляць, а то рэдакцыя збяднее».

Сваю прыхільнасць да выдання на працягу стольких гадоў яна тлумачыць проста: «Кампактна пішаце, няма «вады» ў газеце, не трэба яе выціскаць».

— Пра ўсе заканадаўчыя змены, што маюць адбыцца, заўжды ў вашым выданні можна пачытаць. Я сваім калегам кажу: чытай «Звязду» — прачытаеш усё. Я люблю аналізаваць, і мяне выданне задавальняе цалкам. З ім можна і пасмяяцца, чытаючы «Алё, народ на проваздзе», і здымкі Анатоля Клешчука паглядзець заўжды цікава, якія таксама без гумару не абыходзяцца. Колькі буду жыць — столькі буду «Звязду» выпісваць, так што я ў вас пажыццёвы падпісчык.

На жаль, доўга пагутарыць з пераможцам не давялося, бо на адпачынак часу ў дарожнікаў у гэтую пару няма. Праз якія 15 хвілін жанчына паспяшалася на працу, а вяндлярню ад «Звязды», даволі-такі ёмістую скрынку, дадому завёз на машыне брат Ірыны Іванаўны. Яна паабяцала, што адзначыць прафесійнае свята, гатуючы на новенькай вяндлярні скумбрыю.

Пасля выхадных мы пацікавіліся, як удалася страва.

— У нас атрымалася скумбрыя гарачага вэнджання. Думалі крышку падвэндзіць, каб як у краме было. На гадзіну яе паставілі — дасталі — атрымалася ах, вельмі смачная, — падзялілася наша пераможца.

**Ірына СІДАРОК.** sidarok@zviazda.by

***P. S.*** *Тым часам мы ўжо падрыхтаваліся да новай падпісной кампаніі. Нават набылі карысныя прызы, якія абавязкова разыграем сярод падпісчыкаў на I квартал або I паўгоддзе 2018-га. Што за прызы? Сачыце за газетай — хутка даведаецеся!*

■ З нагоды

# МАРКА ДА 25-годдзя

**Учора ў прэс-цэнтры БЕЛТА адбылася ўрачыстая цырымонія гашэння дзяржаўных знакаў паштовай аплаты (маркі і канверта першага дня) Беларусі, Казахстана і Расіі, прымеркаваных да 25-годдзя МТРК «Мір».**


Фота БЕЛТА.

У цырымоніі прынялі ўдзел **першы намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі Беларусі Дзмітрый ШАДКО, намеснік старшыні МТРК «Мір» Аляксей ІКОННІКАЎ, намеснік старшыні МТРК «Мір», дырэктар тэлеканалаў «МІР» і «МІР 24» Кацярына АБРАМАВА, дырэктар прадстаўніцтва МТРК «Мір» у Беларусі Уладзімір ПЯРЦОЎ, дырэктар філіяла акцыянернага таварыства «Казпошта» — «Паштовы сэрвіс» Нуржан ДЖАБАЛ, намеснік генеральнага дырэктара прадпрыемства «Марка» Вераніка МАКСІМЕНКАВА** і іншыя.

Адразу пасля гашэння дзяржаўных знакаў Дзмітрый Шадко прызнаўся, што лічыць сімвалічным факт менавіта сумеснага выпуску паштовай маркі. «Тэлеканал «Мір» — гэта перш за ўсё адзін з сімвалаў таго, што нашы краіны застаюцца сябрамі, што яны вось ужо 25 гадоў ідуць разам у самых розных сферах жыцця сучаснага грамадства», — сказаў першы намеснік міністра.

Сёння «Мір» вяшчае на рускай мове ў чатырох гадзінных паясах у 23 краінах свету 24 гадзіны ў суткі. МТРК «Мір» — гэта тэлеканалы «Мір», «Мір 24», «Мір HD», радыёстанцыя «Мір», інфармацыйна-аналітычны партал www.mir24.tv і шматфункцыянальная спадарожнікавая сістэма «МІР-Тэлепорт».

Мастацкай асновай паштовай маркі стаў лагатып тэлерадыёкампаніі «Мір», што з'яўляецца пацвярджэннем яе важнай ролі ў інфармацыйным забеспячэнні ўсебаковага супрацоўніцтва краін і прасоўванні ідэй еўразійскай інтэграцыі. У аснове купона і канверта «Першы дзень» — таксама лагатып МТРК «Мір». Тыраж маркі — 56 тысяч. Намінал маркі «А» адпавядае тарыфу на перасылку простага ліста масай да 20 грамаў уключна ў межах Беларусі.

**Сяргей КУРКАЧ.** kurkach@zviazda.by ■

## Неспрыяльныя дні і гадзіны ў лістападзе

| | |
|---|---|
| **1, серада, 0.00 – 8.30** | **16, чацвер, 3.00 – 10.30** |
| **3, пятніца, 5.00 – 12.00** | **18, субота, 13.30 – 21.00** |
| **5, нядзеля, 11.30 – 13.00** | **21, аўторак, 2.30 – 9.00** |
| **9, чацвер, 7.00 – 14.30** | **23, чацвер, 12.30 – 22.00** |
| **11, субота, 11.00 – 18.30** | **26, нядзеля, 4.30 – 10.00** |
| **13, панядзелак, 17.30 – 0.00** | **28, аўторак, 14.00 – 18.30** |
| | **30, чацвер, 20.30 – 22.30** |

500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню. Напачатку было Слова

# СКАРЫНА «АХУТАНЫ ФЛЁРАМ»?..

**Жыццё і творчасць Францыска Скарыны на аснове дакументаў і фактаў, якія дайшлі да нас, канструяванне вобразу нашага першадрукара ў навуковай творчасці больш позніх эпох і яго ўспрыманне сучаснасцю абмеркавалі на міжнароднай юбілейнай навуковай канферэнцыі «Францыск Скарына. Асоба, гісторыя, успрыманне», якая праходзіла ў Беластоку і Гродне. Размова ішла і пра духоўны патэнцыял творчай спадчыны Францыска Скарыны.**

Гаварылася і пра асэнсаванне яго асветніцкай справы, у прыватнасці Уладзімірам Калеснікам, і пра выдавецкую дзейнасць такіх асоб, як айцец Максіміліян Кольбэ і пісьменніца Эліза Ажэшка. На разнастайнасць даследаванняў указвалі іншыя тэмы: мастацкае разуменне Бібліі ў паэтычных творах Рыгора Барадуліна, ацэнка яе перакладаў у парыжскіх лекцыях Адама Міцкевіча, кірыліца і лацінка ў літаратуры для дзяцей на прыкладзе «ABECADLO» Юліяна Тувіма і «А і Б» Сяргея Міхалкова, суадносіны гуку і колеру ў санэце Арцюра Рэмбо «Галосныя»... Ад выступлення да выступленя закраналіся аспекты літаратуразнаўчыя і мовазнаўчыя, гістарычныя і філасофска-эстэтычныя. Тым не менш дух Скарыны, як неаднойчы было вобразна сказана падчас канферэнцыі, працягваў лунаць над прысутнымі.

Доктар філалагічных навук, прафесар Святлана Мусіенка паспрабавала знайсці адказ на пытанне: чаму асобы вакол Скарыны вядомыя нам больш, чым ён сам (мы ведаем пра яго жонку, сучаснікаў і мецэнатаў, якія яму дапамагалі, а сам ён «ахутаны флёрам»):

— Чаму яго забылі на 450 гадоў, і што ён зрабіў, каб памяць пра яго нагадвала конус? Да рэвалюцыі ён уяўляўся выключна як рускі вучоны, і трагедыя заключалася яшчэ і ў тым, што першынство кнігадрукавання ва ўсходнеславянскім свеце прыпісвалася не яму, а Івану Фёдараву. Перыяд пасля рэвалюцыі прадстаўляе яго ўжо як беларускага навукоўца. І толькі калі спаўняецца 450 гадоў ад пачатку кнігадрукавання, пра Скарыну пачынаюць гаварыць ва ўсходнеславянскім маштабе. Сёння ж ён набывае сусветнае значэнне.

У сваім выступленні на канферэнцыі Святлана Мусіенка, адна з галоўных прадстаўнікоў арганізатараў, прадставіла тры тыпы скарынаўскіх вандровак.

— Першы — па веды — у Кракаў і Падую, універсітэты, дзе працавалі вядомыя навукоўцы, у тым ліку і Мікалай Капернік, чые лекцыі Скарына слухаў і з кім дыскутаваў. Другі тып вандровак звязаны з кнігавыданнем. Не даказана, што ён вандраваў па Італіі, але як бы ён пачаў друкаваць кнігі, калі б не патрымаў у руках першую італьянскую друкаваную Біблію? Я веру, што ён быў у Венецыі, і доказы гэтаму, несумненна, недзе захоўваюцца. Трэці тып вандровак — рэлігійны, у Вітэнберг, дзе адбылося асабістае знаёмства з Марцінам Лютэрам. Яго пошук сябе ў рэлігіі звязаны з яго дзейнасцю напрамую. Скарына верыць ва ўсёмагутнасць Бога, але ён слухаў лекцыі Мікалая Каперніка. У важнасці агульных прынцыпаў хрысціянства ён не сумняваецца, але, трэба думаць, яму было прыкра, што чалавек дазволіў сабе падзяліць хрысціянства. Вось чаму, акрамя магутнасці Бога, ён абвяшчае веліч чалавека. А яшчэ ён гаворыць пра любоў да роднай зямлі.

**Прафесар Яраслаў Марэк ЛАЎСКІ, Беластоцкі ўніверсітэт:**

— Вага гэтай канферэнцыі не толькі ў тым, што яна паказвае беларусам і палякам частку іх вялікага сумеснага дзяцінства і святкуе 500-годдзе найважнейшай справы Францішка Скарыны — яго тлумачэння біблейнага тэксту, але, найперш, у тым, што прадстаўляе беларускага творцу як еўрапейскага дзеяча. Для сучаснага чалавека, асабліва за межамі Беларусі, постаць Францыска Скарыны ахутана таямніцай. І гэта дае магчымасці новых пошукаў для новых навукоўцаў. Хоць не выключана, што Скарына застанецца таямнічым назаўсёды падобна Фаусту. Друкар, перакладчык, лекар, вандроўнік па ўсёй Еўропе... Такі жыццёвы шлях можа зацікавіць многіх сучасных маладых людзей, і не толькі на Беларусі.

— Канферэнцыю «Францыск Скарына. Асоба, гісторыя, успрыманне» можна лічыць часткай шырокай дзейнасці нашага ўніверсітэта ў год, калі Скарынам жыве ўся Беларусь, — адзначыў **Мікалай ГРЫНЬКО, дырэктар навуковай бібліятэкі ГрДУ імя Янкі Купалы.**

З беларускага боку ў якасці арганізатараў выступілі Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, філалагічны факультэт і кафедра замежных моў, навуковая бібліятэка і навукова-дыдактычны каардынацыйны цэнтр «Міжнародны інстытут Адама Міцкевіча», а таксама Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Яфіма Карскага і філалагічны факультэт БДУ. Арганізарамі з польскага боку сталі Беластоцкі ўніверсітэт, філалагічны факультэт і кафедра філалагічных даследаванняў «Усход — Захад», а таксама навуковы аддзел Падляскай ваяводскай бібліятэкі імя Лукаша Гурніцкага.

**Святлана ВОЦІНАВА.**


**Извещение об открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Гроднопромстрой», расположенного по адресу: г. Гродно, ул. Суворова, 127 12 декабря 2017 года**

| | |
|---|---|
| Вид аукциона открытый | |
| Предмет аукциона | Капитальные строения:<br>– инвентарный номер 400/С-7031 (здание мастерских) общей площадью 567,2 кв. м (2-этажное кирпичное здание. Год постройки – 1958);<br>– инвентарный номер 400/С-7019 (гаражи) общей площадью 472,2 кв. м (1-этажное здание. Материал стен – ж/б панели, кирпич. Год постройки – 1958);<br>– инвентарный номер 400/С-7026 (материальный склад) общей площадью 759,4 кв. м (1-этажное здание. Материал стен – кирпич. Год постройки – 1956) |
| Начальная цена продажи | **698 745,48 рублей** (с учетом НДС 20%) |
| Кадастровый номер земельного участка и размеры | 440100000001003241 площадью 0,8083 га |
| Месторасположение земельного участка | **г. Гродно, ул. Суворова, 127** |
| Продавец | **Открытое акционерное общество «Гроднопромстрой»** |
| Имущественное право земельного участка | Право постоянного пользования |
| Сумма задатка | 69 875,0 рублей |
| Организатор аукциона | КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел. 72 05 37, 72 05 46 |
| Дата проведения аукциона | **12 декабря 2017 года** |
| Время проведения аукциона | 12.00 |
| Место проведения аукциона | **г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал** |
| Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 57 |
| Дата и время начала приема документов | 2 ноября 2017 года 8.00 |
| Дата и время окончания приема документов | 6 декабря 2017 года 17.00 |

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
– копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 в филиале №400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3-х рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**


■ Подыум

# У чым паедзем у круіз?

## АГЛЯД БЕЛАРУСКАГА ТЫДНЯ МОДЫ

**На тыдні моды ў Нью-Ёрку мадэлі дэфілявалі ў тапачках з махрамі і веласіпедках, а ў Лондане — з клатчамі ў выглядзе падушак. У Мілане мадэльеры здзіўлялі спалучэннем спадніц з высокімі кампрэсійнымі шкарпэткамі, а ў Парыжы — празрыстымі пластыкавымі ботамі і сукенкамі з пер'я. Чаго толькі не бывае на паказах высокай моды! У Мінску з 24 па 29 кастрычніка прайшоў свой тыдзень моды — менш эксцэнтрычны. Раскажам, што прадставілі айчынныя дызайнеры на галоўным fashion-мерапрыемстве беларускай восені.**



У гэты час традыцыйна паказваюцца калекцыі наступнага сезона вясна-лета. Дызайнер Алёна Гарэцкая, напрыклад, стварыла адзенне, у якім можна адправіцца ў круіз. Пінжакі і касцюмы ў палоску, сукенкі ў яркі пальмавы прынт, камбінезоны з фламінга... Абыграны таксама стыль «мілітары» (ён не выходзіць з моды ўжо некалькі гадоў): мадэлі красаваліся ў жакетах, падобных да ваенных, і з брошкамі-ордэнамі.

Гуллівую калекцыю прадставіла Марына Давыдава. У малюнках на рэчах яна іранізуе над павальным захапленнем сэлфі. Не тое, што было раней: касеты, песні Depeche Mode (калі прыглядзецца да адзення на подыуме, можна было заўважыць на ім і выявы першых, і цытаты з другіх). Асноўныя колеры, якія дызайнер выбрала для сваёй калекцыі, — чырвоны, шэры, блакітны, бэжавы, светла-ліловы. А яшчэ Марына Давыдава ведае, як задаволіць тых, хто сам не вырашыў, што хоча надзець. Для гэтых выпадкаў яна прапануе сукенкі, пашытыя быццам з палавінак розных рэчаў. Мяркуючы па калекцыі, наступнай вясной застанецца модным і аксаміт. Толькі будзьце асцярожныя з гэтым матэрыялам: ён павялічвае ў аб'ёме.



Наталля Корж натхнялася стылем «мадэрн». А менавіта — жывапісам Густава Клімта. Таму іскрынкай калекцыі сталі арнаменты і яркія колеры: жоўты, сіні, бірузовы. Фасоны ў многім знаёмыя: сукенка ў падлогу ў бялізнавым стылі, плісіраваная спадніца, падоўжаны жакет. Калі ў вашай шафе такія ёсць, можаце быць спакойныя: модны гардэроб на наступную вясну ўжо гатовы.

Мадэльер Ірына Бойцік зрабіла стаўку на светлыя тоны: малочны, пудрава-ружовы. Яна з ліку тых, хто прытрымліваецца мінімалізму. На думку дызайнера, наступным летам модніцам не абысціся без мужчынскіх касцюмаў і сарафанаў з запахам. Прывычныя клатчы і сакваяжы можна замяніць на шабеты (сумкі, якія носяцца на поясе, — улюбёная мадэль рыначных гандляроў). А яшчэ актуальнымі застануцца мюлі (незнаёмыя з моднай тэрміналогіяй хутчэй назавуць іх тапачкамі) — туфлі з закрытым носам, але без заднікаў.




Да праблемы сацыялізацыі людзей з інваліднасцю звярнулася ў сваёй калекцыі дызайнерка Таццяна Яфрэмава. Вельмі неназойліва: у дэталях на адзенні яна выкарыстоўвала вышыўкі-піктаграмы — элементы «яснай мовы», з дапамогай якой могуць кантактаваць людзі, што маюць праблемы са звычайным маўленнем. Фасоны адзення таксама простыя і лаканічныя. Наступнай вясной Таццяна Яфрэмава задае моду на кракадзілавую скуру ў аксесуарах і паліто і на белы, тэракотавы і залаты колеры.

Паспрабаваць свае сілы на гэтым тыдні моды вырашыла прадпрыемства «Камінтэрн». На працягу 98 гадоў фабрыка шые мужчынскія касцюмы і задавольвае патрэбы сярэднестатыстычнага беларуса, якога прымусіць надзець касцюм можа толькі вяселле і строгі дрэс-код на рабоце. Наступным летам «Камінтэрн» прапануе звярнуць увагу на падоўжаныя кашулі, якія нават пад пінжак носяцца навыпуск, і такі недаацэнены прадмет гардэроба, як камізэлька. З арыгінальных фасонаў — касцюм а-ля форма каратыста. Для падарожжа ў гарачыя краіны самае тое. Колеры калекцыі — ад прывычнага мужчынам сіняга да бэжавага і гарчычнага.

Усяго ў Беларускім тыдні моды прынялі ўдзел больш за 30 дызайнераў. Было прыгожа, ярка, практычна. А вось правакацыі не хапіла (рызыкнуў, бадай, толькі брэнд «Historia Naturalis», які выпусціў мадэляў з заплечнікамі, падобнымі да паштовых скрынь). Будзем чакаць наступным разам.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

**Фота аргкамітэта Беларускага тыдня моды і БЕЛТА**

■ Сучасны падыход

# ПОЛЯ ЧУЕ МАМУ

## Яшчэ крыху, і адпадзе патрэба ў школах для глухіх

**Штогод у Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры отарыналарынгалогіі абследуюцца і атрымліваюць лячэнне каля 4 тысяч дарослых і дзяцей, выконваецца каля 5 тысяч аперацый. Штодня ў трох аперацыйных праводзіцца да 20 аперацый, шмат якіх унікальныя для краіны. Сучаснае абсталяванне дазваляе атрымаць доступ да ўсе аддзелы вуха, горла і носа. Прымяняецца галоўным чынам агульная анестэзія, аднак у некаторых выпадках магчыма і мясцовая — напрыклад, для праверкі слыху непасрэдна на аперацыйным стале.**



Малады хірург Ганна КУПРЫЯНАВА адпрацоўвае вядзенне аперацыі на сярэднім вуху — у далейшым яна будзе займацца менавіта такой паталогіяй.

У КАБІНЕЦЕ, дзе пачатковы агляд дарослых і дзяцей праводзіць загадчык прыёмнага аддзялення Дзмітрый Мальцаў, — усё, што трэба для дыягностыкі захворванняў вуха-горла-носа — тэмпанометр, рынаманометр... У звычайнай паліклініцы такога не сустрэнеш, а для ўстановы аховы здароўя чацвёртага ўзроўню гэта неабходнасць. Накіраваным сюды з усёй краіны пацыентам патрабуецца паглыбленае абследаванне. Выявілі тугавухасць? Пры некаторых яе відах падбіраецца слыхавы апарат.

**Усё часцей парушэнні гукаўспрымальнасці пачалі сустракацца апошнім часам у маладых. Заўчаснае развіццё паталогіі звязваюць у тым ліку са злоўжываннем навушнікамі-затычкамі.**

— Па прагнозах Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, да 2020 года чакаецца рост колькасці людзей з парушэннем слыху — да 20—30 працэнтаў ад усёй колькасці насельніцтва. Таму карэкцыя слыхавых парушэнняў рознымі спосабамі застаецца актуальнай, — тлумачыць **загадчыца аддзялення слыхапратэзавання Святлана КАЗЛОВА.** — Добрыя вынікі паказвае карэкцыя парушэнняў як сярэдняй, так і цяжкай ступені з дапамогай лічбавых слыхавых апаратаў замежнай вытворчасці, якія набываюцца ў краіне за бюджэтныя сродкі. Спецыяльная тэхніка дазваляе нам агледзець стан сярэдняга вуха, памераць зыходны ўзровень гукавога ціску барабаннай перапонкі, а сістэмны праграматар дапамагае настроіць слыхавы апарат. Падборам, настройкай, ацэнкай эфектыўнасці карэкцыі слыхавых апаратаў, адаптацыяй пацыентаў да пратэза займаецца сурдапедагог. Наша аддзяленне штогод выдае каля 800—900 заключэнняў на атрыманне слыхавога апарата дарослым і каля 150 — дзецям...

Статыстыка сведчыць, што ў 1—2 немаўлят на 1000 ёсць парушэнні слыху, — гэта генетыка. Аднак ёсць і шмат іншых прычын у такой паталогіі. Усё часцей парушэнні гукаўспрымальнасці пачалі сустракацца апошнім часам у маладых. Заўчаснае развіццё паталогіі звязваюць у тым ліку са злоўжываннем навушнікамі-затычкамі. Хоць аб'ектыўна з узростам, пачынаючы гадоў з 45, так ці іначай адбываюцца змяненні на ўзроўні ўнутранага вуха, парушаецца разборлівасць маўлення. Стан прагрэсіруе хутчэй, калі ў чалавека ёсць такія захворванні, як артэрыяльная гіпертэнзія, цукровы дыябет.

РАННІ аўдыяскрынінг, калі яшчэ ў радзільні выяўляюць праблему са слыхам, пачаўся ў нашай краіне з 2008 года. Такіх дзетак дадаткова абследуюць і пасля выпіскі з радзільні. Разам з тым праблему нярэдка першымі заўважаюць бацькі, насцярожаныя тым, што малое не рэагуе на гукі, не вымаўляе ў гадзік простую фразу кшталту «мама, дай!». На гэта звярнула ўвагу і мама двух дачок Кацярына. Ні ў яе, ні ў мужа, ні ў іншых сваякоў ніякай слыхавой паталогіі няма. А вось у абаіх дзетак — 5-гадовай Сафіі і 4-гадовай Паліны — глухата. Першы раз сям'я прыехала з Мазыра ў цэнтр отарыналарынгалогіі на абследаванне тры гады назад. Дзяўчаткам паставілі дыягназ, правялі аперацыю, якая называецца «кахлеарная імплантацыя». Цяпер на вушках дзяўчатак можна бачыць спецыяльныя прыстасаванні, пры дапамозе якіх яны чуюць!

Імплант перакадзіруе гукі ў электрычны сігнал, пера-



Вось так выглядае «штучнае вушка» — сіліконавы пратэз.

дае на магніт, і ўстаноўлены ва ўлітку электрод стымулюе слыхавы нерв. Таму асноўным паказаннем для падобнай аперацыі з'яўляецца захаванне функцыі слыхавога нерва. Чуць з дапамогай слыхавога імпланта можна з той жа гучнасцю і інтэнсіўнасцю, з якой чуем усе мы. Хоць сам гук усё ж такі крыху зменены. Як кажуць дарослыя, што некалі страцілі слых і якім ёсць з чым параўноўваць, — у такім гуку адчуваецца нейкае металічнае адценне. Таму да чужароднага цела ў любым выпадку трэба прыстасавацца, а дзецям (тым больш тым, якія ад нараджэння пазбаўлены слыху) патрабуецца спецыяльнае навучанне. Займаюцца ўсім гэтым інжынер па наладцы кахлеарных імплантаў, сурдолаг і аўдыёлаг. Пасля падключэння апарата дзіця знаёміцца са светам гукаў, дапамагаюць адрозніць, што называецца, дыханне суседа ад гукаў на вуліцы. Паступова можна навучыць адрозніваць словы, а затым дзіця пачынае і размаўляць.

Сурдапедагог дзіцячага отарыналарынгалагічнага аддзялення Алена Мельнікава просіць Паліну назваць жывёл, намаляваных на картках. Дзяўчынка выдатна спраўляецца з задачай. Яе галасок гучыць так, што аб наяўнасці апарата не здагадаешся. Як прыйдзе час, дзяўчаткі пойдуць у школу. Сафія ўжо занятая адпаведнай падрыхтоўкай, ведае літары.

А на індывідуальныя заняткі па маўленні з Гродзеншчыны прыехалі мама з 4-гадовым Дзяніскам. У яго маторная алавія — першы ўзровень моўнага развіцця. «Спачатку хлопчык не меў зрокавага кантакту, не рэагаваў на дотык, у ягоным слоўнікавым запасе было ўсяго некалькі гукападобных слоў, — тлумачыць **настаўнік-лагапед псіханеўралагічнага аддзялення, галоўны пазаштатны настаўнік—дэфектолаг Міністэрства аховы здароўя Беларусі Алена ДАЛДОВА.** — Мы працуем зараз над тым, каб праз месяц заняткаў Дзяніска асвоіў некалькі назоўнікаў, дзеясловаў і мог сфарміраваць кароткую фразу. Наогул пры маўленчых парушэннях мы бяром дзяцей з 3,5 да 18 гадоў».

| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 26.09.2017

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **21.11.2017** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **17.11.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42.<br>Email: auction@cpo.by |

Центр Промышленной Оценки
- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белсантехмонтаж-2», г. Минск, ул. Брилевская, 15 |

**Предмет аукциона**

**Продаже на аукционе одним лотом подлежат объекты недвижимого имущества в составе:**

| Наименование, общая площадь, инвентарный номер | Назначение | Адрес |
|---|---|---|
| **Здание АБК,** (составные части: подвал), **1 423,5 кв. м**, **400/С-75196** | Здание административно-хозяйственное | г. Гродно, ул. Индустриальная, 2Б |
| **Проходная, 20,1 кв. м, 400/С-90975** | Здание неустановленного назначения | г. Гродно, ул. Индустриальная, 2Б/1 |
| **Склад горюче-смазочных материалов,. 49,1 кв. м, 400/С-90973** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | г. Гродно, ул. Индустриальная, 2Б/2 |
| **Материально-технический склад** (составные части: навес, платформа, платформа), **46,5 кв. м, 400/С-90977** | | г. Гродно, ул. Индустриальная, 2Б/3 |
| **Материально-технический склад с мастерскими** (составные части: пристройка), **736,6 кв. м, 400/С-90982** | | г. Гродно, ул. Индустриальная, 2Б/7 |
| **Подкрановый путь** (составные части: Д – подкрановый путь; Е – подкрановый путь), **141,5 кв. м, 400/С-113078** | Сооружение специализированное железнодорожного транспорта | г. Гродно, ул. Индустриальная, 2Б, подкрановый путь |
| **Благоустройство территории** (составные части: А – покрытие асфальтобетонное, а1 – бетонный бортовой камень, Б – покрытие бетонное, В – ограждение – плиты ж/б, Г – ограждение металлическое), **6727 кв. м, 400/С-113080** | Сооружение благоустройства | г. Гродно, ул. Индустриальная, 2Б, благоустройство территории |

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Площадь: 1,0296 га; вид права: предоставлен на праве постоянного пользования; целевое назначение: эксплуатация и обслуживание зданий и сооружений |

**Обременения:** объект недвижимости (здание АБК) находится в залоге (ипотеке) у ОАО «Белинвестбанк» и обременен договорами аренды. Подробная информация на сайте организатор аукциона www.cpo.by

**Начальная цена с НДС 20% – 1 047 203,19 белорусских рублей**

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с №BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **5** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 18.10.2017

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **14.11.2017** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **10.11.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71.<br>Email: auction@cpo.by |

# Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой зарослая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

**Трэба памятаць, што гародніна, якую сеялі пад зіму, не прызначаная для захоўвання. Яе лепш хутчэй спажыць.**

## ШТО СЕЯЦЬ, ШТО САДЖАЦЬ

Садзяць пад зіму ў асноўным цыбульныя расліны, якія маюць запас пажыўных рэчываў. Пасадкай займаюцца і на пачатку лістапада, але толькі ў заглыбленых цыпліцах, каб цыбуліны паспелі ўтварыць моцную каранёвую сістэму і падрыхтавацца да зімоўкі, а адрастаць лісты будуць толькі вясной.

Ну, а пасевы пад зіму, калі, вядома, вы загадзя падрыхтавалі грады, праводзяць па мерзлай зямлі ў лістападзе. Калі выпаў снег, яго змятаюць так, каб адкрылася зробленая загадзя баразёнка.

Насенне холадаўстойлівых культур, якое сеюць пад зіму, мае ўласцівасць прарастаць не адразу, таму рызыка, што яно ўзыдзе ў момант зімовых адліг, невялікая.

У той жа час вясной, пасля ўсходаў, такая гародніна павінна хутка фарміравацца. Звычайна гэта дробнанасенныя расліны — морква, цыбуля, кітайская капуста, шпінат, салата, агуручная трава, пятрушка, кроп, радыска, салатная гарчыца і іншыя холадаўстойлівыя культуры. Каб не расчаравацца, заўсёды трэба дакладна ўяўляць сабе, што можна атрымаць у выніку падзімовых пасеваў. І не чакаць ад сваёй гародніны таго, што яна даць у прынцыпе не можа.



### Навошта тарфяная коўдра (мульча) для падзімовых пасеваў

Насенне для пасеву выбіраюць самае лепшае. Сеюць яго раўнамерна, на глыбіню 0,5—1 см, сухім і пратраўленым, засыпаюць друзлай, урадлівай зямлёй і адразу яшчэ на 3 см укрываюць торфам або перагноем.

Тарфяная коўдра (мульча) стварае роўны тэмпературны рэжым, бо насенне не павінна прарасці раней, чым трэба, інакш яно загіне.

Мульча абараняе глебу ад утварэння скарынкі, а вясной захоўвае вільгаць, спрыяе хуткаму выграванню зямлі і ахоўвае далікатныя ўсходы ад замаразкаў.

Торф ці перагной загадзя варта ачысціць ад насення пустазелля. Трэба сачыць, каб грады заўсёды былі добра накрытыя снегам. Расліны з перазімавалага насення не толькі з'яўляюцца раней, але бываюць, як правіла, больш моцныя і трывалыя, бо яны прайшлі натуральную прыродную загартоўку.

### Сакрэты пасеву буракоў пад зіму

Некаторыя лічаць, што буракі можна сеяць пад зіму і без усялякіх агаворак. Гэта не зусім правільна. У буракоў кароткі перыяд яравізацыі. Што гэта значыць? Пасля таго як гароднiна дасць 5—6 лістоў, а тэмпература пры гэтым усталюецца нізкая дадатная (ад 2 да 10 °С), расліны праходзяць стадыю яравізацыі. Замест буйнога караняплода яна фарміруе маленькі. І яшчэ кветканос. Таму ў паўночных шыротах буракі пад зіму не сеюць.

У больш паўднёвых рэгіёнах гэта рабіць можна, але не дзеля караняплода, які мае таварны выгляд, а для атрымання пучковай прадукцыі. Сутнасць у тым, каб паспець выкарыстоўваць буракі, хоць і маленькія, у самыя раннія тэрміны.

## РЫХТУЕМ МНАГАЛЕТНІКІ ДА ЗІМЫ

**Большая частка кветкавых шматгадовых раслін, якія зімуюць у адкрытым грунце ў нашых кліматычных умовах, з'яўляюцца адносна марозаўстойлівымі. Аднак здараюцца бясснежныя зімы, якія суправаджаюцца моцнымі маразамі. У гэтым выпадку маладыя пасадкі кветак могуць вымерзнуць. Каб перастрахавацца і не дапусціць гэтага, расліны ўсё-такі неабходна прыкрываць на зіму.**

Не трэба гэта рабіць да наступлення маразоў, бо ва ўмовах цёплай восені расліны пад тоўстым покрывам будуць падаправаць.

Прыкрываць кветкавыя культуры лепш за ўсё тады, калі ўстановяцца першыя пастаянныя маразы і на глебе з'явіцца цвёрдая скарынка не менш за 2—3 сантыметры таўшчынёй, якая не адтае. Звычайна гэта прыпадае на пачатак лістапада.

У якасці матэрыялаў, якія ўцяпляюць, можна выкарыстоўваць перагной або торф, сухое лісце, лапнік, пілавіннe, лісце дрэў. Пласт павінен быць таўшчынёй не менш за 7—10 сантыметраў.

Расліны неабходна прыкрываць у два прыёмы: у першую чаргу варта насыпаць перагной, а пазней, з надыходам больш нізкіх тэмператур, трэба выкласці зверху сухое лісце. Такі метад выкарыстоўваюць для абароны флёксаў, півонь, касачоў. Гradкі, дзе растуць цыбульныя, лепш прысыпаць торфам.



А вось для руж сховішча зладзіць больш складана. Пасля абразання расліны па тым жа прынцыпе трэба прысыпаць глебай прыкладна да паловы куста, а з надыходам пастаянных моцных маразоў трэба накрыць кусты драцянымі каркасамі або драўлянымі скрынямі. І толькі зверху іх трэба атуліць плёнкай з поліэтылену, каб на расліны не трапляла вільгаць.

Вясной, як толькі снег сыдзе, сховішча можна зняць, але зноў не адразу, таксама за два прыёмы, бо заўсёды могуць вярнуцца замаразкі.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.10 | 17.36 | 9.26 |
| Віцебск — | 8.03 | 17.21 | 9.18 |
| Магілёў — | 8.00 | 17.26 | 9.26 |
| Гомель — | 7.52 | 17.27 | 9.35 |
| Гродна — | 8.24 | 17.51 | 9.27 |
| Брэст — | 8.20 | 17.57 | 9.37 |

## Месяц

*Першая квадра 28 кастрычніка.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

## Імяніны

*Пр. Клеапатры, Івана, Сяргея.*
*К. УСІХ СВЯТЫХ.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




# УСМІХНЕМСЯ

**Па статыстыцы, на пытанне «Ці лічыце вы сябе прыгожай?» большая частка апытаных жанчын адказвае: «Не». І барані вас Бог з імі пагадзіцца.**

— Чуў, што на працу ўладкаваўся?
— Так, ахоўнікам на складзе.
— А графік які?
— Дзень спіш, тры адпачываеш.

**Дзённік сына.**
**Чырвоным — заўвага настаўніка: «Бійся на перапынку!»**

**Сінім — заўвага сына да заўвагі настаўніка: «Затое перамог!»**

— Ах, які сабачка! Сю-сю-сю, ты мой маленькі. Колькі каштуе?
— 1 000 рублёў.
— За гэтую фігавіну з лапкамі?!



caricatura.ru

Любімую матулю, **Ірыну Уладзіміраўну КАНЮТУ**, віншуем з юбілеем! Няхай усмешка не сыходзіць з тваіх вуснаў, а вочы не ведаюць слёз! Будзь здаровай, шчаслівай, бадзёрай! Няма большай радасці, калі ты сустракаеш на родным парозе. Дзякуй, родная, што ты ў нас ёсць!

**Дзеці.**



Даты | Падзеі | Людзі

**1 ЛІСТАПАДА**

**1632** год — створана Магілёўская праваслаўная епархія. Узнікла па ініцыятыве кіеўскага мітрапаліта Пятра Магілы як адзіная праваслаўная епархія Беларусі ў межах сучаснай краіны з кафедрай у Магілёве. У сярэдзіне XVIII стагоддзя на некалькі гадоў Магілёўскай кафедрай завалодалі ўніяты. У 1755 годзе была зроблена спроба яе закрыць, але дзякуючы намаганням епіскапа Георгія Каніскага епархію ўдалося захаваць.

**1903** год — нарадзіўся (вёска Лабковічы, цяпер у Крычаўскім раёне) Кузьма Венядзіктавіч Кісялёў, дзяржаўны дзеяч Беларусі, дыпламат, кандыдат медыцынскіх навук. З 1937 года — наркам аховы здароўя БССР, у 1938—1940-м — старшыня СНК БССР, у 1944—1966 гадах — наркам, міністр замежных спраў Беларусі. Меў ранг надзвычайнага і паўнамоцнага Пасла. На чале дэлегацыі БССР у 1945 годзе на канферэнцыі ў Сан-Францыска падпісаў Статут ААН, у 1947-м — па выніках Парыжскай мірнай канферэнцыі (1946) — мірныя дагаворы БССР з Балгарыяй, Венгрыяй, Італіяй, Румыніяй і Фінляндыяй. Узначальваў дэлегацыі БССР на сесіях Генеральнай Асамблеі ААН у 1946—1965 гадах. Памёр у 1977 годзе.

**1933** год — нарадзіўся (вёска Babakomshchyna... 



**1942** год — нарадзіўся (вёска Гірэвічы Валожынскага раёна) Аркадзь Уладзіміравіч Русецкі, беларускі гісторык, культуролаг, доктар гістарычных навук, прафесар. Даследуе тэорыю, гісторыю, праблемы сучаснага развіцця мастацкай культуры Беларусі, творчасць беларускіх пісьменнікаў.

**1967** год — сёння спаўняецца 50 гадоў з дня выхаду першага нумару газеты «Вячэрні Мінск», якая асвятляе ўсе аспекты жыцця горада і краіны. Віншуем калег з юбілеем!

### Было сказана

**Генадзь ПАШКОЎ,**
**паэт, перакладчык, публіцыст:**

*Што адмерана —*
*пройдзеш са славай,*
*ці прасунешся —*
*як набяжыць.*
*Ды нікому не дадзена права*
*Выбраць час, у якім яму жыць.*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4150.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 31 кастрычніка 2017 года.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

1 лістапада 2017 г. №41 (425)




стар. 3

Заўсёды на «прамой лініі»



стар. 5

Прадпрымальніцкая «жылка» Быхаўшчыны



стар. 8

Што можа талака?

ТЭМА ТЫДНЯ

## НОВЫЯ ВАКАНСІІ — НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

### Як ідзе работа па стварэнні працоўных месцаў?



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**33 тысячы. Столькі беларусаў, згодна з заданнем на першае паўгоддзе, неабходна было ўладкаваць менавіта на новыя працоўныя месцы. Справіцца ўдалося на 92,5 працэнта. Ці атрымаецца да канца года ўзяць планку ў 70 тысяч новых месцаў? У якіх сферах вакансіі адкрываюцца больш актыўна? І што могуць зрабіць мясцовыя органы ўлады, каб паспрыяць пашырэнню існуючых прадпрыемстваў і з'яўленню новых?**

### «Да канца года ўсе актывізуюцца»

За першае паўгоддзе ў Беларусі было ўладкавана на работу 297,5 тысячы чалавек. З іх кожны дзясяты (гэта 30,8 тысячы грамадзян) — на новае працоўнае месца. Прычым 17 тысяч гэтых вакансій былі адкрыты на новых прадпрыемствах.

Заданне па стварэнні працоўных месцаў цалкам выканалі толькі дзве вобласці: Брэсцкая (на 105,6 працэнта) і Гродзенская (на 108,2 працэнта). Калі глядзець дэталёва па рэгіёнах, то не справіліся 56 раёнаў са 128. У Мінску, напрыклад, заданне па ўвядзенні новых вакансій выканана толькі на 87,1 працэнта. Праўда, і план для сталіцы самы вялікі — за паўгода ўладкаваць на створаныя месцы 14,3 тысячы чалавек (для параўнання, планка для Гомельскай вобласці — 3,2 тысячы чалавек). стар. 4

## ГЛЯНЕМ У ДВАРЫ — СКАЖАМ, ЯКІЯ ГАСПАДАРЫ

СВАІМІ РУКАМІ

**«Я хачу, каб мае дзеці раслі менавіта ў такім двары», — так гавораць практычна ўсе, хто выпадкова ці наўмысна трапіў на ўскраіну Гомеля, дзе сярод звычайных шматпавярховак з відам на могілкі вырас новенькі дзіцячы спартыўна-забаўляльны гарадок. Ён цалкам пабудаваны НА ГРОШЫ мясцовых жыхароў. Вуліцы Давыдаўская і 70 гадоў БССР стануць вам арыенцірам, як захочаце на свае вочы пабачыць, што можна зрабіць, калі натхніцца выдатнай ідэяй — зрабіць дзяцінства шчаслівым сёння, а не тады, калі ў бюджэце горада знойдуцца грошы.**

### Сакавіцкія мары

Дарэчы, жыхары, члены камітэта тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання «Сонечны», якіх узначаліла матуля ўдзэрэцэ Ірына Піскун, спачатку звярнуліся ў Камунальнае жыллёвае рамонтна-эксплуатацыйнае унітарнае прадпрыемства (КЖРЭУП) «Савецкае» з патрабаваннем: у мясцовых бюджэтах павінны быць закладзены сродкі на добраўпарадкаванне дзіцячых пляцовак з адпаведным абсталяваннем — вось і ўстанавіце — згодна з заканадаўствам.

— На наша патрабаванне адказалі: выбачайце, у мясцовым бюджэце на гэтыя мэты не закладзена ніводнага рубля. З'явяцца сродкі — мы вернемся да згаданай ідэі, — успамінае Ірына размову ў сакавіку.

Відаць, многія на яе месцы рукі склалі б. Але ж і ў Ірыны, і ў яе сяброўак з суседкамі дзеці падрастаюць, а накіраваць іх бурную энергію ў мірнае рэчышча няма дзе. Можна, канешне, чакаць, пакуль рак у Сажы свісне, аднак такая перспектыва актыўных жанчын ніяк не задавальняла. Энтузіязму і рашучасці хапіла на тое, каб кінуць покліч: а давайце скінемся пакрысе і зробім шчасце сваімі рукамі і за свае грошы.

І пайшлі, пяшчотныя і крохкія, па кватэрах. З ідэяй і капелюшом. Каб пераконваць асабіста кожнага жыхара, чым такая перспектыва для яго карысная.

— Вельмі цяжка было пераканаць людзей паверыць у рэальнасць планаў і ўкласці ў гэта ўласныя сродкі. У нашым квартале 11 шматпавярховых дамоў, у якіх жыве прыблізна 650 сем'яў. У рэалізацыі праекта сёння ўдзельнічаюць 170. Менавіта дзякуючы ім атрымалася сабраць 2,5 тысячы рублёў. Некаторыя людзі здавалі грошы па тры, а то і па чатыры разы. Асобныя — і больш. Большасць, канешне, чакае, што з гэтага ўсяго ўрэшце атрымаецца. Ёсць і адкрытыя скептыкі, якія наадрэз адмаўляюцца браць удзел у будаўніцтве дзіцячага гарадка, але пільна сочаць за яго ходам. Дарэчы, іх можна зразумець. Доўгія гады нас прывучалі да таго, што ўсе праблемы, якія датычацца грамадскага добраўпарадкавання і камфорту, за нас вырашала дзяржава. стар. 7



Ірына ПІСКУН.



# НЮАНСЫ «ПАРЛАМЕНЦКАЙ ДЫПЛАМАТЫІ»

## *На думку віцэ-спікера верхняй палаты парламента, патэнцыял груп сяброўства выкарыстоўваецца не ў поўным аб'ёме*

**У верхняй палаце пад кіраўніцтвам намесніка старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Мар'яны Шчоткінай адбыўся семінар для кіраўнікоў груп беларускага парламента па супрацоўніцтве з парламентамі замежных дзяржаў. У рабоце семінара ўзялі ўдзел члены Савета Рэспублікі, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў — кіраўнікі рабочых груп па супрацоўніцтве з парламентамі замежных дзяржаў, а таксама прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання.**



Адкрываючы пасяджэнне, віцэ-спікер падкрэсліла, што за 20 гадоў дзейнасці парламента назапашаны багаты вопыт у прасоўванні інтарэсаў нашай краіны на міжнароднай арэне, створана і працуе сістэма рабочых груп. Але, на думку намесніка старшыні Савета Рэспублікі, патэнцыял згаданых груп рэалізаваны не ў поўным аб'ёме: «Дзейнасць «груп сяброўства» павінна быць максімальна актывізавана і яе прыярытэтам павінна быць прасоўванне эканамічных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь на знешнім контуры, рэалізацыя канкрэтных інвестыцыйных праектаў». У гэтай сувязі галоўныні мэтамі семінара віцэ-спікер назвала абазначэнне алгарытму дзейнасці груп супрацоўніцтва, выпрацоўку механізмаў каардынацыі на ўсіх узроўнях.

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рахманаў адзначыў, што мінулы семінар — адна з новых формаў работы Нацыянальнага сходу. «Яго задача — даць адпаведную падрыхтоўку парламентарыям, каб яны маглі арыентавацца ў складанай рабоце, якая называецца «парламенцкая дыпламатыя», і ўносіць свой уклад у прасоўванне інтарэсаў краіны за мяжой», — лічыць ён.

# НАБЛІЖАЮЦЦА ПАРЛАМЕНЦКІЯ СЛУХАННІ

## *Члены Савета Рэспублікі ўзялі ўдзел у пасяджэнні Парламенцкага сходу*

**У расійскім Пскове адбылося 49-е пасяджэнне пастаянна дзеючага пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі (ПС) семінара па пытаннях будаўніцтва Саюзнай дзяржавы і пасяджэнне Камісіі ПС па заканадаўстве і рэгламенце.**



Семінар і пасяджэнне Камісіі ПС сталі важным этапам падрыхтоўкі да маючых адбыцца парламенцкіх слуханняў, прысвечаных збліжэнню заканадаўства нашых краін у частцы забеспячэння роўных правоў грамадзян. Пытанне аб збліжэнні заканадаўства ініцыявана членамі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і падтрымана дэпутатамі Дзяржаўнай Думы Расійскай Федэрацыі. Мяркуецца, што слуханні пройдуць у снежні 2017 года ў Бранску ў рамках чарговай сесіі ПС.

Ад Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу ў мерапрыемствах прынялі ўдзел старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Ала Бодак і намеснік старшыні гэтай камісіі Віктар Чайчыц.

# САМ-НАСАМ З ПРАБЛЕМАЙ НЕ ПАКІНУЦЬ

## *Сенатары правялі прамую лінію і асабісты прыём грамадзян*

**Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Мар'яна Шчоткіна правяла прамую тэлефонную лінію на тэму «Праварымяняльная практыка законаў Рэспублікі Беларусь у сацыяльна-працоўнай сферы».**

Таксама на мінулым тыдні ў верхняй палаце беларускага парламента старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір Панцюхоў правёў асабісты прыём грамадзян. Падчас яго заяўнікі ўзнімалі пытанні, якія датычацца працаўладкавання і работы органаў дзяржаўнага кіравання.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*



НАПЯРЭДАДНІ

# «ВЫБАРЫ БУДУЦЬ СКЛАДАНЫЯ»

## Усяго ў мясцовыя Саветы дэпутатаў будзе абрана 18 111 дэпутатаў

**Такую лічбу назвала старшыня Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА падчас семінара-вучобы для актыву Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» па падрыхтоўцы да ўдзелу ў выбарчай кампаніі дэпутатаў мясцовых Саветаў 28-га склікання. Падчас мерапрыемства яна распавяла пра асноўныя аспекты арганізацыі выбараў, а таксама выказала ўпэўненасць у тым, што грамадскія аб'яднанні возьмуць актыўны ўдзел у электаральным працэсе.**



Фота БЕЛТА.

— Праект указа аб прызначэнні выбараў ужо накіраваны на ўзгадненне ў Савет Міністраў і Камітэт дзяржкантролю, — адзначыла Лідзія Ярмошына. — Пасля атрымання адказу мы яго накіруем кіраўніку дзяржавы для разгляду і падпісання. Мы прапануем, і я думаю, што гэта адзіная верагодная дата па тэрмінах, каб выбары прайшлі 18 лютага 2018 года.

Старшыня Цэнтрвыбаркама таксама дадала, што выбарчая кампанія ў мясцовыя Саветы дэпутатаў стартуе праз некалькі тыдняў. «Да 23 кастрычніка ўжо павінны былі прайсці сесіі мясцовых Саветаў, якія прынялі рашэнні па колькасці і напаўняльнасці выбарчых акруг. Пасля прызначэння выбараў пачнецца працэс утварэння выбарчых камісій», — сказала Лідзія Ярмошына.

Акрамя таго, яна заявіла, што мясцовыя назіральнікі на мясцовыя выбары не запрашаюцца. Аднак ёсць іншая прапанова. «У нас захавалася традыцыя — і калі кіраўнік дзяржавы яе падтрымае, то так будзе і на гэтых выбарах — што пасля дзяржаў, якія пастаянна працуюць у Мінску, маюць права ажыццяўляць функцыі міжнародных назіральнікаў. Думаю, яны папрацуюць не толькі ў Мінску, але і паездзяць па рэгіёнах», — паведаміла старшыня Цэнтрвыбаркама.

— Выбары будуць вельмі складаныя — і гэта сапраўды так, — адзначыла Лідзія Ярмошына. — Пры любым развіцці падзей складанасць будзе існаваць. Калі мы гаворым пра выбары спакойныя, пра малую альтэрнатыўнасць, пра адсутнасць цікавасці, то будзе праблема з яўкай выбаршчыкаў. Калі выбары будуць альтэрнатыўныя, то абавязкова з'явяцца спробы разгайдаць нашу палітычную і сацыяльную лодку.

Дарэчы, у параўнанні з мінулым чатырохгадовым перыядам колькасць мясцовых Саветаў зменшылася на 19, а колькасць саміх дэпутатаў — на 705 чалавек. У першую чаргу, гэта адбылося за кошт скарачэння Саветаў дэпутатаў у сельскай мясцовасці. «Таксама ў нас зменшылася колькасць адзінак раённага ўзроўню. Нават не колькасць Саветаў, а колькасць выбарчых акруг, — дадала яна. — Трэба павялічваць колькасць выбарчых акруг да максімуму ў Мінску». На думку Лідзіі Ярмошынай, ёсць сэнс скарачаць выбарчыя акругі там, дзе адбываецца адток насельніцтва, аднак гэта павінна вырашацца на ўзроўні мясцовых улад.

Як адзначыў **старшыня грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Аляксандр РАДЗЬКОЎ**, арганізацыя плануе ажыццявіць маніторынг грамадскіх настрояў. «У нас шмат задач, і мы з цікавасцю будзем удзельнічаць у гэтых выбарах, прапануючы сваіх кандыдатаў у дэпутаты. Мы будзем назапашваць вопыт для свайго развіцця, для развіцця грамадства — і дзяліцца ім, — падкрэсліў Аляксандр Радзькоў. — Адна з нашых задач — маніторынг. Мы хочам адчуць, чым людзі занепакоеныя, якія ў іх праблемы».

У «Белай Русі» сапраўды назапашаны вопыт удзелу ў выбарчай кампаніі — на гэты момант у мясцовых Саветах дэпутатаў працуе больш за 5 тысяч членаў гэтага грамадскага аб'яднання, ёсць яны і ў Савеце Рэспублікі, і ў Палаце прадстаўнікоў. Па словах старшыні арганізацыі, выбары — «гэта магчымасць прадстаўляць свае ідэі, напрацоўкі, даводзіць іх да нашых суграмадзян».

Усяго ў мерапрыемстве ўзялі ўдзел больш за 200 чалавек з усіх рэгіёнаў краіны — гэта старшыні, намеснікі старшыняў абласных, раённых арганізацый «Белай Русі», а таксама прадстаўнікі органаў выканаўчай улады.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

ВЫЯЗНЫ ПРЫЁМ

# «Вока» ўлады не павінна «замыльвацца»

**З якімі праблемамі прыходзяць да кіраўнікоў мясцовай улады падчас асабістых прыёмаў? Гэтым пытаннем чарговы раз зацікавіўся наш карэспандэнт.**



Як адзначыў **старшыня Гарадоцкага райвыканкама Пётр КАРАБАЧ**, пераважна агучваюцца тыповыя для ўсёй краіны пытанні: стан дарог, работа ЖКГ.

— Яшчэ бываюць нараканні наконт работы крамаў і аддзяленняў паштовай сувязі. Напрыклад, жыхар раёна пытаўся, калі ўжо з'явіцца ў продажы танныя цыгарэты? Хай і для нямногіх, але даступныя па цане тытунёвыя вырабы, канешне, павінны прадавацца. Наогул у крамах райпа год таму былі значныя праблемы з асартыментам. У прыватнасці, з малочнай і мяснай прадукцыяй. Але цяпер, у прынцыпе, сітуацыя значна палепшылася... Прыклад таго, як станоўча вырашылася праблема ЖКГ — запрацавала воданапорная вежа ў аграгарадку Сцяпанавічы. Старое збудаванне доўга не функцыянавала. Людзі падчас выязнога прыёму паведамілі пра гэта. Мы зрабілі ўсё магчымае, каб зняць праблемнае пытанне. Усталявалі новую помпу, водаправод «запусцілі» па новай, — расказаў кіраўнік раённай улады.

Ён адзначыў, што добра інфармуюць пра нюансы вясковага жыцця старэйшыны. Яны пастаянна на сувязі з сельскімі выканкамамі, звяртаюцца і ў райвыканкам. І вельмі ахвотна прыходзяць на выязныя прыёмы, куды іх спецыяльна запрашаюць.

Што датычыцца дзейнасці мясцовай, у тым ліку прадстаўнічай улады ў цэлым, кіраўніцтва райвыканкама чакае тут большай ініцыятывы.

— У першую чаргу старшыні сельскіх Саветаў павінны адчуваць патрэбы землякоў. І ніякага «вока замылілася». Мы павінны працаваць для нашых людзей на нашай зямлі. Аказваць паслугі насельніцтву — наша асноўная задача. Менавіта плануемыя кіраўніцтвам райвыканкама выязныя прыёмы стымулююць адказных асоб на месцах, — працягвае Пётр Карабач.

Аналізуючы планы на найбліжэйшы час, кіраўнік райвыканкама звярнуў увагу на невялікую актыўнасць у пытаннях мясцовага добраўпарадкавання. Насамрэч дзіўна: часта ў глыбінцы скардзяцца на недахоп грошай, а ў канкрэтна ўзятым раёне па гэтым артыкуле засталіся незапатрабаванымі 7 тысяч рублёў. Адпаведныя грошы па лініі занятасці насельніцтва можна было б патраціць на аплату дзейнасці па ўпрыгожванні вуліц... Але не ўдалося сабраць людзей, каб яны навялі прыгажосць.

Недастаткова задзейнічаны і турыстычны патэнцыял. У яго раскрыцці вялікую ролю павінны адыгрываць сельвыканкамы.

— Лясы займаюць 60% тэрыторыі раёна, сярод іншых азёр ёсць цудоўнае возера Лосвіда. На аднайменнай турыстычнай базе зрабілі добры рамонт. Можна распрацаваць цікавы водны маршрут, бо па вадзе з азёр пры жаданні дабярэшся да Заходняй Дзвіны. Паляўнічыя ўгоддзі вялікія — сёлета актывізавалі аказанне адпаведных платных паслуг. Але, напрыклад, мала аграрных сядзіб. Іх, на жаль, можна на пальцах пералічыць. Сельвыканкам трэба падтрымліваць кожную ініцыятыву. Каб на тэрыторыі кожнага сельсавета былі «пункты» для турыстаў, дзе яны маглі б не толькі адпачыць, але і ўбачыць выступленні самадзейных артыстаў, — разважае Пётр Карабач.

Многія чулі і пра «другія Раўбічы» — лыжаролерную трасу ў Гарадку. Каля яе — спартыўна-аздараўленчы цэнтр еўрапейскага ўзроўню. Асаблівасць клімату дазваляе праводзіць там спаборніцтвы па лыжных відах спорту тады, калі ў большасці раёнаў краіны ўжо снегу няма. Таму мясцовая ўлада будзе больш актыўна спрыяць павелічэнню колькасці прыезджых аматараў спорту, пры аддзеле адукацыі райвыканкама адкрыты турыстычны цэнтр.

Ужо ёсць прыклады актывізацыі турыстычнай сферы. Былая школа, якую зачынілі, стала летнікам круглясутачнага знаходжання — першым у раёне. Тут стварылі вяровачны гарадок. У адной са школ за кошт грошай, якія зэканомілі ў выніку аптымізацыі, усталявалі ўнікальны для ўсёй Віцебскай вобласці скалдром. З дапамогай грошай адпаведнага праекта ЕС стварылі шэраг спартыўных пляцовак пры установах адукацыі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ДАСТУПНЫ ДЛЯ КОЖНАГА

## «Добрую ідэю нашых жыхароў мы заўсёды гатовы падтрымаць», — канстатуе дэпутат Гродзенскага гарадскога Савета Пётр ПАГРАНОЎСКІ:



**Мы сустрэліся на яго працоўным месцы. Пётр Рыгоравіч узначальвае аддзел лагістыкі і продажаў ААТ «Малочны свет», а ў дэпутацкім корпусе ўваходзіць у склад камісіі па эканоміцы і бюджэце. Падчас размовы неаднойчы званіў яго мабільны тэлефон. Непакоілі і па вытворчых, і па дэпутацкіх пытаннях. «Вось такая гэта работа — быць заўсёды на прамой лініі з жыхарамі сваёй акругі», — сказаў Пётр Пagраноўскі пасля чарговага званка.**

**— Пётр Рыгоравіч, зваротаў ад выбаршчыкаў звычайна шмат паступае?**

— Многа было зваротаў, калі смеццеправоды ў шматпавярхоўках заварвалі. Некаторым не падабалася, як размяшчаліся кантэйнерныя пляцоўкі. Памятаю, адзін з выездаў, калі жыхары хацелі, каб пляцоўка была каля дамоў, але там паблізу міні-рынак, вялікая колькасць народу. Таму вырашылі размясціць пляцоўку за дамамі і крыху «залезлі» ў зялёную зону. Людзям прыходзілася тлумачыць, што гэта горад, тут трэба ўлічваць інтарэсы значнага кола насельніцтва.

**— Ці ёсць спецыфічныя пытанні?**

— Напрыклад, з перасяленцамі. Раней такіх праблем не ўзнікала. Мне давялося займацца сям'ёй з Расіі, якая прыехала ў Гродна даглядаць састарэлую сваячку. А член гэтай сям'і таксама мае інваліднасць. Прыйшлося паклапаціцца, каб знайсці яму работу, вырашыць праблему з прапіскай, а таксама з бясплатным харчаваннем дзяцей у школе, бо сям'я шматдзетная. Яны часта тэлефанавалі. Скажу, што пытанні вырашыліся, хоць патрабаванні ў перасяленцаў бываюць завышаныя.

**— Вы абмовіліся, што вам часта тэлефануюць. А чаму не прыходзяць на прыём?**

— На прыём у ЖЭСе не ўсе паспяваюць трапіць, а тэлефон у мяне для кожнага выбаршчыка даступны, таму і тэлефануюць. Прыходзіцца заўсёды быць на «прамой лініі» з выбаршчыкамі. Дэпутацкі корпус — гэта такі праваднік паміж народам і ўладай. Я бачу сваю задачу ў тым, каб выслухаць праблему і вырашыць яе ў рамках закона. Без інцыдэнтаў.

**— Ці бывае, што насельніцтва адносіцца да ўлады пасажывецку?**

— Хачу адзначыць, што колькасць патрабаванняў да ўладаў апошнім часам змяншаецца. Калі я тры гады таму пачынаў дэпутацкую работу, зваротаў было больш. За гэты час многае вырашылася, ды і людзі самі сталі больш актыўныя.

**— Можа з якімі-небудзь прапановамі выходзяць?**

— Былі прапановы па азеляненні. І самі жыхары гэтыя акцыі падтрымліваюць. Далучаюцца і да нашых дэпутацкіх суботнікаў. Сёлета, калі мы выходзілі на санітарную ачыстку і азеляненне, шмат людзей прыйшло з намі працаваць.

**— Як дэпутат можа дапамагчы ў ажыццяўленні ідэі сваіх выбаршчыкаў?**

— Добрую ідэю заўсёды падтрымаем. Калі дэпутат сам не можа вырашыць пытанне, ён выносіць яго на агульнае абмеркаванне, і праблема вырашаецца. Так адбылося з прапановай нашых гараджан накont веладарожак. Іх колькасць павялічылася дзякуючы такім зваротам. Пытанне спачатку выносіцца на пасяджэнне гарсавета, па ім прымаецца рашэнне, і адпаведныя службы павінны дзейнічаць згодна з рашэннем. Гэта датычыць і пашырэння безбар'ернага асяроддзя. Выканаўчая ўлада прынялася за праблему высокіх бардзюраў, калі дэпутаты з падачы жыхароў гэтыя пытанні ўзнялі.

**— А выканаўчая ўлада не пярэчыць рашэнням дэпутатаў?**

— На пасяджэннях і сесіях гарсавета часта прысутнічае мэр горада, пры спрэчных пытаннях імкнёмся знаходзіць кампрамісnae рашэнне.

**— Якія пытанні выклікаюць дэбаты?**

— Добраўпарадкаванне тэрыторый. Дэпутаты просяць больш выдзяляць сродкаў на гэтыя мэты, каб горад быў чысты і прыгожы.

**— Тыя рашэнні, якія прымаюцца, яны рэальна ўвасабляюцца ў жыццё?**

— Заўсёды на кантролі рамонт дваровых тэрыторый — прадстаўнікі камунальных службаў пастаянна выступаюць са справаздачамі аб ходзе работ. Дарэчы, на добраўпарадкаванне ідзе значная частка бюджэту горада, амаль 70% забіраюць камунальнікі. Гэта і захаванне жылога фонду, і рамонт фасадаў, што асабліва важна зараз, калі ў нас стала больш турыстаў, у тым ліку і бязвізавых.

**— Заканадаўчая база не адстае ад жыцця ці, можа, стрымлівае развіццё?**

— Наадварот, апошнім часам прынята нямала даволі ліберальных законаў. Але з некаторымі, я лічу, і паспяшаліся. Гэта датычыць Дэкрэта №3 аб сацыяльным утрыманстве. Мы амаль кожны тыдзень збіраліся, каб разгледзець адпаведныя звароты людзей. Усяго іх было каля тысячы. Палова зваротаў была вырашана на карысць заяўнікаў.

**— Але такі дэкрэт павінен быць? Ён можа атрымаць працяг?**

— Лічу, што ён правільны, — утрыманец карыстаецца тымі ж ільготамі, як і той, хто працуе. Толькі работнік уносіць за гэта ў бюджэт падаткі, а ўтрыманец нічога не ўносіць. Калі дэкрэт будзе падрабязна распрацаваны, можна гаварыць аб яго ўзнаўленні. Але ўсё трэба прадугледзець. Каб у людзей не ўзнікала пытанняў, якія потым прыходзіцца вырашаць на месцах. Трэба прапісаць усе катэгорыі насельніцтва, якія маюць права на льготы. Не ўваходзіш у іх — павінен плаціць. Не трэба забываць, што ў нас сацыяльна арыентаванае грамадства.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

### У тэму

**Барыс БАГДАНЕЦ, намеснік старшыні Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў:**

— Калі закон не адпавядае настрою ў грамадстве, яго трэба ўдасканаліць. Такі працэс цяпер ідзе па Дэкрэце №3 «Аб папярэджванні сацыяльнага ўтрыманства». Мы падрыхтавалі больш за дзясятак прапаноў па яго дапаўненні. Частка іх датычыць сітуацый з лячэннем альбо назіраннем за хворымі, цяжарнасцю, родамі, знаходжаннем у дэкрэтным водпуску.

Больш пільна трэба разгледзець пытанні, якія датычаць ваеннаслужачых, іх сем'яў, студэнтаў, а таксама грамадзян, якія былі пазбаўлены свабоды менш чым на 183 каляндарныя дні. Варта пашырыць пералік катэгорый для грамадзян, якія займаюцца вытворчасцю сельгаспрадукцыі. Уносім прапанову, каб мясцовыя Саветы дэпутатаў мелі права вызваляць ад выплаты збору тых грамадзян, якія знаходзяцца ў цяжкіх жыццёвых умовах. Разам з тым лічым мэтазгодным вызначыць пералік дакументаў, якія б гэты факт пацвярджалі, і даць магчымасць мясцовым уладам выходзіць на патрэбныя арганізацыі для атрымання гэтых дакументаў.

## Унеслі лепту ў добрую справу

**У Асіповічах напярэдадні юбілею Кастрычніцкай рэвалюцыі прайшла акцыя «100 дрэў у гонар рэвалюцыі». Яе ініцыятар — старшыня Асіповіцкага райсавета дэпутатаў Аляксандр ПУЗІК, які адначасова з'яўляецца членам Камуністычнай партыі Беларусі.**

— Мы паслядоўнікі партыі, тэзісы якой — за пабудову моцнай квітнеючай Беларусі. На першым плане ў нас абарона чалавека і яго інтарэсаў. Мы выступаем за сацыяльна арыентаваную дзяржаву, каб у нашай краіне былі створаны ўмовы для ўсебаковага развіцця асобы, — кажа дэпутат.

Заклік асіповіцкіх камуністаў падтрымалі прадстаўнікі аб'яднання «Белая Русь», БРСМ, прафсаюзныя і ветэранскія арганізацыі. Удзел у акцыі па пасадцы дрэў прынялі і мясцовыя жыхары, якія таксама вырашылі ўнесці лепту ў добрую справу.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## Ясені ў кампанію да клёнаў

**Дэпутаты гомельскага гарадскога Савета пасадзілі больш за 50 ясеняў на алеі ў адным з мікрараёнаў Гомеля.**

Між тым першыя 50 клёнаў побач з новабудоўлямі по вуліцы Чачэрскай з'явілася сёлета ў сакавіку. Цяпер, падчас кастрычніцкай акцыі «Зялёны дворык», дэпутат Палаты прадстаўнікоў Алег Леўшуноў адзначыў, што ініцыятыва будзе падтрымана і ў іншых мікрараёнах горада над Сожам. Дарэчы, парламентарый заўважыў, што падчас падобных акцый у адкрытым дыялогу з дэпутатамі грамадзяне задаюць пытанні, якія іх хвалююць, выказваюць свае прапановы.

— Мы бачым, што цікавасць да мерапрыемстваў па добраўпарадкаванні расце. Кожны з нас хоча жыць у прыгожым і ўтульным кутку. Добра, што людзі разумеюць: у сваім доме парадак трэба наводзіць самім.

Да акцыі далучыліся жыхары мікрараёна, моладзь, ветэранскія арганізацыі. Спецыялісты дзяржаўнага прадпрыемства «Чырвоны гвяздзік» дапамаглі падабраць высадкі, а таксама далі рэкамендацыі, як правільна даглядаць дрэвы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

## Зручна і па прымальнай цане

**Новы трактар «Беларус» запрацуе для патрэб насельніцтва Лёзненскага раёна. Гэтым «жалезным канём» Лёзненскі сельвыканкам прэміравалі на абласных «Дажынках». Пры ім функцыянуе КУП «Канашкава», дзе і будзе выкарыстоўвацца тэхніка.**

— Грамата і сертыфікат на набыццё трактара — ацэнка нашай працы па навядзенні парадку на зямлі, фермах, па эфектыўным землекарыстанні. Прызналі найлепшымі ў вобласці, — паведаміла **Святлана ПУКАВА, старшыня Лёзненскага сельскага выканкама**.

У мясцовым камунальным унітарным прадпрыемстве цяпер будзе два «Беларусы». Ёсць яшчэ прычэп, касілка, плуг, культыватар.

Дарэчы, у вырашэнні пытання тэхнічнага забеспячэння КУПа «на старце» яго дзейнасці дапамог **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр ПАПКОЎ**, які, бываючы ў глыбінцы, цікавіцца дзейнасцю КУПаў.

Прадпрыемства стварылі ў 2014-м годзе, і цяпер яно запатрабаванае. У КУП «Канашкава» вясной людзі могуць зрабіць заказ на апрацоўку зямлі перад сяўбой. Летам «купаўцы» косяць сена для патрэб прыватных падворкаў. Дапамагае КУП і ў рабоце на зямлі двум сельгаспадарчым прадпрыемствам — падкошваюць пашу.

Таксама займаюцца нарыхтоўкай дроў, чысцяць дарогі ад снегу, добраўпарадкоўваюць могілкі, вывозяць смецце. Адпаведная дамова ёсць з мясцовымі камунальнікамі.

У штаце прадпрыемства, акрамя дырэктара, трактарыст і бухгалтар.

Цікава, што расцэнкі на паслугі засталіся на ўзроўні леташніх. І яны па кішэні вяскоўцам і дачнікам.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by.*

## Найлепшы па бяспецы

**Каб пераканаць насельніцтва клапаціцца пра сваю ж бяспеку, ратавальнікам часта прыходзіцца дэманстраваць выключныя прамоўніцкія здольнасці. І гэтаму вельмі садзейнічаюць адмысловыя конкурсы.**



**Каб утрымаць усе дыпломы гэтага конкурсу, Аляксею *(справа)* спатрэбілася дапамога свайго начальніка Дзмітрыя СКАЗАВА.**

У Магілёве прайшлі чарговыя двухдзённыя выпрабаванні сярод супрацоўнікаў раённых аддзелаў па надзвычайных сітуацыях — на найлепшага прапагандыста. Акрамя візітоўкі і прэзентацыйнага відэаролика, трэба было зявіць праект на сацыяльную тэматыку, правесці журналісцкае расследаванне, пазмагацца за званне «акулы пяра», прайсці тэсціраванне, а яшчэ прадэманстраваць прамоўніцкае майстэрства непасрэдна перад мэтавай аўдыторыяй рознага ўзросту — ад дзятвы да скептычна настроеных студэнтаў.

Лепш за іншых з заданнямі справіўся **інспектар групы прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Бабруйскага гаррайаддзела па НС Аляксей САФРОНАЎ**. Зараз яму трэба будзе адстойваць гонар Магілёўскай вобласці на рэспубліканскім узроўні. Што асабліва прыемна, Аляксей — падпісчык «Звязды».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

МЕРКАВАННІ

## Якіх вытворчасцяў не хапае на вашай тэрыторыі і што неабходна стварыць?

**Стварэнне працоўных месцаў — гэта тэма, якой удзяляецца вялікая ўвага з боку ўлад. Сёння пры жаданні можна знайсці работу, аднак бывае і так, што ў пэўным мястэчку папросту няма прадпрыемства, якое дапамога рэалізаваць здольнасці шукальніка. Можа, трэба ствараць нешта новае?**

**Намеснік старшыні Чэрвеньскага раённага выканаўчага камітэта па эканоміцы Алена ШЛОМА:**

— Адназначна можна сказаць, што патрэба ў арганізацыі вытворчасцяў на тэрыторыі Чэрвеньскага раёна існуе. І ў гарадах, і ў вёсках гэта пытанне надзённае. На сённяшні дзень ёсць варыянты, якія мы можам прапанаваць зацікаўленым, у будаўніцтве, — гэта пляцоўкі з развітой інфраструктурай, усімі неабходнымі камунікацыямі — электраэнергіяй, водазабеспячэннем. Мы праводзім работу і прадаём зямельныя ўчасткі пад арганізацыю вытворчасцяў. Напрыклад, па выніках продажу пляцоўкі каля адной з нашых вёсак можна сказаць, што ўжо ў наступным годзе ў нас рэальна будуць працоўныя месцы. Летась мы прадалі два ўчасткі, цяпер заканчваецца распрацоўка праектаў, а ў наступным годзе арганізуюць вытворчасці. Але да нас пакуль не прыходзяць маштабныя прадпрыемствы з сур'ёзнымі аб'ёмамі вытворчасцяў, сёння гэта толькі невялікія арганізацыі, якія даюць 20—30 працоўных месцаў.

**Старшыня Сольскага сельскага выканаўчага камітэта Смаргонскага раёна Міхаіл МІРСКІ:**

— На нашай тэрыторыі ёсць адзін стары завод, які цяпер перайшоў да замежнага прадпрыемства. Таму вельмі хацелася б уцягнуць яго ў гаспадарчы абарот як мага хутчэй, бо такім чынам з'явяцца новыя працоўныя месцы. Дарэчы, у нас была спецыяльная камісія, якая ўстанавіла, калі павінны быць задзейнічаны невыкарыстаныя аб'екты. Таму мы вельмі чакаем, калі ўсё запрацуе. Якога прадпрыемства ў нас не хапае? Ведаеце, зараз наша сельскагаспадарчае прадпрыемства на добрым рахунку, рыбгас не з горшых у краіне. Не сказаў бы, што мы пакрыўджаныя. Сёлета пашыраецца птушкафабрыка на нашай тэрыторыі, уведзены новы забойны цэх. Акрамя таго, будзе праведзена рэканструкцыя былой свінафермы, пакуль уласнымі сіламі. А гэта ўсё — працоўныя месцы. Так што новыя прадпрыемствы нам і не патрэбныя, мы працуем з існуючымі.

**Начальнік аддзела занятасці і сацыяльнай абароны насельніцтва ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Шклоўскага раённага выканаўчага камітэта Алена ПІМЕНАВА:**

— Я лічу, што Шклоўскаму раёну ўсяго хапае. У нас ёсць і завод, і фабрыка, і сельскагаспадарчыя арганізацыі, і ўкладанні нармальныя. Я сказала б, што ў нас выконваецца баланс — хапае і людзей, і прадпрыемстваў. Адзіны аспект — гэта калі б эканоміка крыху лепш працавала, тады і заробкі былі б вышэйшыя. Гэта маё адзінае пажаданне, а так у нас сапраўды ўсё добра. Ёсць цікавы прыклад аб'яднання — цяпер ствараецца холдынг сельскагаспадарчых вытворчасцяў. Так што мы не стаім на месцы, а актыўна працуем. Вядома, штосьці і згортваецца, але гэта непазбежна. Ці задавальняюцца патрэбы людзей, якія шукаюць пэўнае працоўнае месца? Усё ўпіраецца ў заработную плату. Людзям хочацца менш працы, але пры гэтым больш грошай.

**Старшыня Крыўскага сельскага выканаўчага камітэта Буда-Кашалёўскага раёна Аксана ЕЛІСЕЕНКА:**

— Пытанне новых працоўных месцаў не вельмі актуальна для нас, паколькі ў нас ёсць вакансіі, на якія мы пакуль не можам знайсці работнікаў. Перад тым, як абмяркоўваць стварэнне новых месцаў, трэба запоўніць наяўныя! Індывідуальныя прадпрымальнікі і бізнес на нашай тэрыторыі асабліва не развіваюцца. З чым гэта звязана? Проста ў нас ёсць дзе працаваць людзям, што ж тады прыватнікам тут рабіць? Зямля ў гаспадарках апрацоўваецца, на заводзе — больш за 100 чалавек, таму ўсе занятыя. Я перакананая: тыя, хто жадае працаваць, маюць такую магчымасць. Чаму ёсць вольныя месцы? Існуюць вакансіі, для якіх у людзей папросту няма неабходнай адукацыі і навыкаў. Атрымліваецца нестыкоўка працоўнага кадра і патрабаванняў з месца. Заробак? На сённяшні дзень абстаноўка такая, што заробак усюды невялікі. Трэба гэты час перачакаць, усё яшчэ будзе. Упэўнена, што вакантныя месцы запоўняцца.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** lukashevich@zviazda.by

# НОВЫЯ ВАКАНСІІ — НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны лічаць, што заданне на 2017-ы ўсё ж такі будзе выканана. «Звычайна ўсе актывізуюцца бліжэй да канца года. Да таго ж маленькія прадпрыемствы (з колькасцю работнікаў да 100 чалавек) Белстатам у агульнай статыстыцы не ўлічваюцца», — кажа **начальнік упраўлення палітыкі занятасці ведамства Алег ТОКУН.**

Ён дадае, што вакансіі ствараюцца як для спецыялістаў, так і для прадстаўнікоў рабочых прафесій.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### Персанал набіраюць у гандлі і грамадскім харчаванні

Каля паловы новых працоўных месцаў прыпадае на сферу аказання паслуг, гандлю, грамадскага харчавання. Так, у сталіцы 43,1 працэнта ад усіх створаных вакансій — у арганізацыях гандлю, 11,2 — у галіне інфармацыі і сувязі, 7,9 — на вытворчасці.

Якія менавіта месцы з'яўляюцца? Мінчанін Аляксандр Дарашэвіч, напрыклад, паўгода таму адкрыў рэстаран азіяцкай кухні «Ronin» з дастаўкай на дом, дзе было створана каля 50 вакансій: набіраліся кухары, афіцыянты, кур'еры, адміністратары, аператары кол-цэнтра.

— Я ўсё жыццё працую ў грамадскім харчаванні. Канкурэнцыя ў гэтай сферы страшэнная, — прызнаецца прадпрымальнік. — Лідары рынку ўжо 10—12 гадоў існуюць, таму новым кавярням складана. Але мы змаглі заняць сваю нішу, бачым, што колькасць гасцей расце. Паназіяцкую кухню — в'етнамскую, карэйскую, японскую — мы адаптуем пад беларускі густ і нашы лакальныя прадукты. Ялавічыну, свініну, агародніну закупляем тут, бо на імпарце не выжывеш.

Пад рэстаран Аляксандр зняў памяшканне ў 260 квадратных метраў і, па яго словах, «выціскае з гэтага па максімуме». Таму ў дадатак запусціў і службу дастаўкі.

— Сярэдні заробак у абслугоўвага персаналу — 400 рублёў. Вялікіх грошай абяцаць пакуль не магу, трэба глядзець на дынаміку. Але працаваць у нас цяжка, патрабаванні жорсткія: усё ж такі санітарны стан на кухні павінен быць ідэальным, — кажа Аляксандр Дарашэвіч.

Іншая сетка рэстаранаў хуткага харчавання з пачатку года ўвяла пад дзвесце новых працоўных месцаў.

— Мы адкрылі чатыры аб'екты ў Мінску і два ў Гродне, — расказвае **аперацыйны дырэктар «Бургер Кінг Беларусь» Наталля КАНІНА.** — У кожны рэстаран былі патрэбны кухары, касіры, менеджары. Патрабаванняў па ўзросце і адукацыі няма: персанал праходзіць навучанне непасрэдна на працоўным месцы.

— Ахвотных уладкавацца на работу было шмат?

— Дастаткова. Але гэта залежыць і ад сезоннасці: летам звяртаецца менш людзей, восенню і зімой больш. Паколькі ў нас зручны гібкі графік, прыходзіць шмат студэнтаў, якія могуць сумяшчаць работу з вучобай.

Што да заробкаў, то, адзначае Наталля Каніна, яны параўнальныя з тымі, што сёння прапануе рынак. Для кухараў і касіраў пачатковая стаўка — 3,5 рубля ў гадзіну (пры стандартным 40-гадзінным працоўным тыдні атрымліваецца 560—600 рублёў у месяц). Заробак менеджараў залежыць ад стажу і аб'ёму працы.

### Вытворчасць ідзе ў рэгіёны

Менш актыўна, але ствараюцца вакансіі і на вытворчасцях. На дзяржынскім прадпрыемстве «МАВ», дзе выпускаюць лакафарбавыя матэрыялы, з пачатку года прынялі на новыя месцы 19 чалавек. Гэта такія спецыялісты, як кантралёр якасці тэхналагічнага працэсу, інжынер-праграміст па аўтаматызацыі складской лагістыкі і вытворчасці, спецыяліст па рабоце з кліентамі. Запрашаліся апаратчыкі прыгатавання замесаў: прадпрыемства не спраўлялася з вялікім аб'ёмам заказаў, таму расшыралася і ўводзіла трэцюю змену.

Нядаўна кампанія выкупіла будынак ільнозавода, які рыхтаваўся да ліквідацыі. Патрэбны былі рабочыя рукі, каб прывесці яго ў добры стан. Таму наймаліся рабочыя па комплексным рамонце, электрагазазваршчыкі.

— У сакавіку, калі ўсе будоўлі былі згорнуты, мы набіралі будаўнікоў, — дадаюць у аддзеле кадраў. — Людзі з вялікім вопытам самі хадзілі — прасіліся на працу. Рабочых, у прынцыпе, не складана знайсці. А вось спецыялістаў — праблема. Апаратчыкаў мы самі рыхтуем, бо іх нідзе не навучаюць.

**На «АМКАДОР» — кіруючую кампанію холдынга (яна ўключае ў сябе тры заводы) за дзевяць месяцаў бягучага года прынялі (і на новыя месцы, і на існуючыя) 306 чалавек. З іх кіраўнікоў — 28, спецыялістаў — 107, рабочых — 171. Узялі сёлета рэкордную колькасць маладых спецыялістаў — 46.**

У холдынгу адзначаюць, што ў першую чаргу ім патрэбны кваліфікаваныя кадры, паколькі яны выпускаюць высокатэхналагічную прадукцыю — больш за 120 мадыфікацый машын. Плюс свой адбітак накладае мадэрнізацыя вытворчасці. Так, нядаўна тры цэхі былі заменены адным участкам праграмнага кіравання.

У канцы гэтага года «АМКАДОР» пачне будаўніцтва трох заводаў — у Калодзішчах, Кобрыне і Гомелі. А значыць, увядзе ў рэгіёнах і дадатковыя працоўныя месцы.

### Памяшканне пад офіс — у бясплатную арэнду

Для з'яўлення новых вакансій патрэбны спрыяльныя ўмовы. Таму мясцовыя органы ўлады мусяць паклапаціцца аб тым, каб стварыць іх. У сталіцы, напрыклад, індывідуальныя прадпрымальнікі і юрыдычныя асобы могуць браць у бясплатную арэнду памяшканні, калі абавязуюцца зрабіць там рамонт і ўвесці новыя працоўныя месцы (згодна з рашэннем Мінгарсавета ад 25 верасня 2012 года №250). Адзінае, яны не вызваляюцца ад аплаты камунальных паслуг.

— Такім чынам мы вырашаем адразу некалькі задач: эфектыўнае выкарыстанне дзяржаўнай маёмасці, стварэнне працоўных месцаў і спрыяльных умоў для вядзення бізнесу. Гэта зручна як арганізацыям з вопытам, так і прадпрымальнікам-навічкам, — лічаць у Мінскім гарадскім тэрытарыяльным фондзе дзяржмаёмасці.

У бясплатнае карыстанне прапануюцца аб'екты, якія на працягу 60 дзён не былі запатрабаваны. Такіх па горадзе 79: у асноўным гэта плошчы на першых паверхах дамоў і падвальныя памяшканні (з поўным спісам можна азнаёміцца на сайце Мінгарвыканкама і фонду дзяржмаёмасці). Каб атрымаць іх у арэнду, трэба звярнуцца ў ЖРЭА па месцы іх знаходжання. На бясплатных умовах аб'екты здаюцца на тэрмін, неабходны наймальніку, каб акупіць затраты на рамонт.

Пакуль прадпрыемствы ставяцца да гэтай магчымасці вельмі асцярожна, пралічваюць усе рызыкі. На сёння ў бясплатную арэнду ўзяты толькі адзін аб'ект.

— Баяцца: а што далей? Зраблю рамонт, патрачуся — а раптам памяшканне аднімуць? — разумеюць гэтыя апасенні ў тэрытарыяльным фондзе дзяржмаёмасці. — Таму мы ініцыявалі змяненні ў заканадаўства. Пасля заканчэння тэрміну бясплатнага карыстання ў ІП і юрыдычных асоб будзе права ўзяць гэта памяшканне ў звычайную арэнду без аўкцыёну пры мінімальным каэфіцыенце. Яны змогуць таксама выкупіць аб'ект. Змяненні хутка ўступяць у законную сілу, і прадпрымальнікі будуць больш абаронены.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** lubneuskaya@zviazda.by

**У тэму**

### ДЗЕ ЎЖО ПЛАЦЯЦЬ «ПА ПЯЦЬСОТ»?

Самыя вялікія заробкі традыцыйна ў галіне ІТ. Там у сярэднім атрымліваюць 3,4 тысячы рублёў. У топе таксама работнікі паветранага транспарту: у верасні іх заработныя платы складалі 2,3 тысячы. 1,4 тысячы ў месяц маюць тыя, хто задзейнічаны ў горназдабываючай прамысловасці, 1,3 тысячы — на перапрацоўцы коксу і нафтапрадуктаў. Планку ў 500 долараў перасягнулі таксама сярэднія заробкі на вытворчасці фармацэўтычных прэпаратаў, у аптовым гандлі, выдавецкай дзейнасці і галіне тэлекамунікацый, фінансавай і страхавой дзейнасці, навукі.

Менш за ўсіх, паводле Белстата, у верасні атрымлівалі супрацоўнікі цырульняў і салонаў прыгажосці — 440 рублёў у месяц. Невысокая аплата захоўваецца ў сацыяльных работнікаў (462 рублі) і ў бібліятэкараў, музейных работнікаў і іншых дзеячаў культуры (464 рублі).

ЭКАНОМІКА З КРЭАТЫВАМ

# ЗНАЙСЦІ ПРАЦУ Ў ВЁСЦЫ ЛЯГЧЭЙ ПРАДПРЫМАЛЬНЫМ

## У Быхаве прайшоў выніковы кірмаш рэгіянальных ініцыятыў у сферы ўстойлівага развіцця

**Апошнія гады ў сельскай мясцовасці мацнее рух па выхаванні ў насельніцтва прадпрымальніцкай жылкі. Гэтым займаюцца ўсе — мясцовыя ўлады, дэпутаты, грамадскія арганізацыі, міжнародныя фонды. І поспехі ёсць. Усё болей чалавек знаходзіць сабе прымяненне і працу менавіта дзякуючы лакальным ініцыятывам. І гэта асабліва бачна на такіх вось мерапрыемствах. У Быхаў прыехалі аўтары як ужо «раскручаных» праектаў, так і пачаткоўцы, дэпутаты, эксперты, спонсары, усе, каму цікава займацца чымсьці новым і перспектыўным.**

НЕКАЛЬКІ гадоў таму «МС» пісала пра поспехі краснапольскіх жыхароў у асваенні праекта «Зялёная эканоміка саду для адраджэння вёскі (дрэвы супраць беднасці і дэградацыі зямлі)». У праекце прыняло ўдзел 40 краснапольскіх сем'яў і Пачапоўская школа. Было прыемна ўбачыць прадстаўнікоў гэтага раёна ў Быхаве на кірмашы ініцыятыў, куды яны прыехалі са сваімі саджанцамі. На базе школы закладзены гадавальнік з 5 тысяч саджанцаў пладова-ягадных культур, нядаўна «асартымент» папоўніўся дэкаратыўнымі кустамі, а ў будучым тут плануюць вырошчваць яшчэ і кветкі.

— Сёлета на продажы саджанцаў мы атрымалі першыя грошы, якія можам патраціць на патрэбы школы і развіццё ініцыятывы, — радуецца **дырэктар вучэбна–педагагічнага комплексу ў аграгарадку Пачапы Краснапольскага раёна Валянціна ШАПАВАЛАВА.** — Наша ініцыятыва распаўсюдзілася на ўстановы адукацыі ў Клімавічах і Чэрыкаве. Плюс дапамагаем закладваць сад школе ў Казеллі нашага раёна.

> Ініцыятыва аказалася карыснай і для насельніцтва. Праект стаў для некаторых сем'яў сродкам для існавання — яны заклалі сады і маюць магчымасць зарабляць грошы на сваёй працы.

Са Слаўгарада на кірмаш прыехала аж некалькі прадстаўнікоў, чые праекты паспяхова рэалізаваліся і развіваюцца далей.

— Цяпер мы не ўпускаем магчымасці паўдзельнічаць у праектах, ведаем, як сябе падаць, і іншых вучым, — кажа **дырэктар Слаўгарадскай школы №1 Ігар КАВАЛЁЎ.** — З 2014 года працуе наш цэнтр па энергазберажэнні, дзе адукоўваем дзяцей і, наогул, усё насельніцтва. А яшчэ вучым дарослых камп'ютарнай пісьменнасці, напісанню бізнес-праектаў, ініцыятыў. Цяпер яны таксама ўдзельнічаюць у такіх вось кірмашах.

Разам з дырэктарам школы на кірмаш у якасці валанцёраў прыехалі і вучні — Максім Бандарэнка і Мікіта Гарэлікаў. Прызнаюцца, што з задавальненнем займаюцца папулярызацыяй «школьных» ініцыятыў, не выключана, што калісьці абавязкова паспрабуюць і свае сілы. Галоўнае, што яны ўжо ведаюць, як гэта рабіць.

Не хавалі сваіх поспехаў і слаўгарадскія сыравары. Тамара Цвярдоўская з Рудні, напрыклад, нядаўна рэалізавала праект «Сырная даліна» — побач з яе домам зроблены асобны павільён, дзе яна дэманструе адна-вяскоўцам і ўсім ахвотным майстар-класы па прыгатаванні сыроў. Там і конкурсы, і дэгустацыі, і ўрачыстыя прыёмы.

Праграма малых грантаў Глабальнага экалагічнага фонду падтрымала адкрыццё ў Слаўгарадскім раёне двух цэнтраў дамашняга сыраварства — у Гіжэнцы і Лясной, дзе будзе створана два міні-цэхі, што дазволіць у некалькі разоў павялічыць выпуск сыроў. У Лясную пераедзе і сырная лаўка са Слаўгарада. «А яшчэ мы закупляем «Купаву» з халадзільным абсталяваннем. Куды нас запросяць, туды і паедзем», — падзялілася радасная навіной **сыравар Галіна ТАРАН.** У ініцыятыве прымае ўдзел 14 чалавек, але суполка адкрытая



Раман МЕЛЬНІКАЎ: «Будучае — за крэатыўнай эканомікай».

для ўсіх. Трэба толькі мець санкніжку і карову або казу, каб была свая сыравіна. Астатняму навучаць. Галіна Таран, дарэчы, сумяшчае сваю дзейнасць з работай ветурача. Сырамі занялася пасля таго, як пакаштавала дамашні выраб у сяброўкі. Захацелася зрабіць самой. З той пары ўсё больш захапляецца. У гаспадарцы ўжо дзевяць коз. Старэйшы сын, дарэчы, пайшоў на слядах маці — вучыцца на ветэрынара. Зараз непасрэдны памочнік Галіны і, як яна спадзяецца, спадчыннік справы — прыёмны сын Анатоль, якому 12 гадоў.

СЛАЎГАРАД наогул першы ў вобласці рэалізаваўся ў сферы прасоўвання ініцыятыў, а цяпер паказвае прыклад іншым. За апошнія некалькі гадоў да «ініцыятыўнага» руху прымкнулі Краснапольскі, Клічаўскі, Чэрыкаўскі і Быхаўскі раёны. На апошнім кірмашы сваё жаданне больш актыўна ўдзельнічаць у прасоўванні ідэй выказалі Крычаўскі і Хоцімскі раёны.

— Апошнія тры гады праекты міжнароднай тэхнічнай дапамогі пачалі актыўна працаваць на тэрыторыі Магілёўскай вобласці, і гэта толькі радуе, — кажа **начальнік аддзела прадпрымальніцтва камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама Вольга ЯШЫНА.** — Дастаткова прыгадаць Хоцімскі раён, дзе за кошт еўрапейскіх грантаў атрымалася рэалізаваць карысную ідэю па ўдасканаленні работы з цвёрдымі камунальнымі адходамі. Аўтар ініцыятывы Жылкамгас атрымаў 600 тысяч еўра, на якія былі закуплены два аўтамабілі па вывазе смецця, пагрузчык, прэс і кантэйнеры еўрапейскага ўзроўню. Плюс створаны два працоўныя месцы.

На тэрыторыі Магілёўскай вобласці гэты кірмаш рэгіянальных ініцыятыў ужо шосты. Асабліва прадукцыйнымі з іх сталі апошнія тры, лічыць **дырэктар Міжнароднага фонду развіцця сельскіх тэрыторый Сяргей ТАРАСЮК.** Удзел пачалі прымаць не асобныя людзі або арганізацыі, а так званыя мікрарэгіёны (сельсаветы, пасёлкі, вуліцы...) Сёлета ў рамках праекта «Майстэрня мясцовых экалагічных ініцыятыў для развіцця мікрарэгіёнаў» паступіла болей за 40 заявак, з якіх трэцяя частка падтрымана Праграмай малых грантаў Глабальнага экалагічнага фонду — сумамі ў памеры ад 2 да 2,5 тысячы долараў. «Гэта, вядома, невялікія сумы, але дастатковыя для таго, каб людзі пачалі варушыцца, зрабілі першы крок, — кажа Сяргей Тарасюк. — Галоўнае, каб у іх з'явілася жаданне дзейнічаць. А мы дапамажам скаардынаваць ім сваю дзейнасць і стаць на ногі. Нездарма наш кірмаш праводзіцца ў краіне ў рамках тыдняў устойлівага развіцця».

Сярод пастаянных суарганізатараў кірмашоў — **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Таццяна КАНАНЧУК.**

— Кірмаш — гэта заўсёды завяршэнне нейкага пэўнага этапу, — кажа яна. — Да гэтага вядзецца работа з ініцыятыўнымі групамі, насельніцтвам, вывучаецца патэнцыял мясцовасці, вызначаецца, што на ёй можна рэалізаваць. Потым праводзяцца трэнінгі, вучоба людзей. На кірмашы заўсёды запрашаюцца эксперты, міжнародныя і замежныя арганізацыі, якія падтрымліваюць ініцыятывых. Летась у Быхаве праводзіўся кірмаш па прадпрымальніцтве, і мы запрашалі супрацоўнікаў банкаў, якія падрабязна кансультавалі, як весці справу, як лепей выкарыстоўваць ініцыятывы. Некаторыя раёны ўсё яшчэ скептычна ставяцца да гэтай дзейнасці. Маўляў, тысяча-дзве долараў — гэта дробязі. Але справа не ў гэтым, а ў тым, што трэба мяняць мысленне людзей, нешта рабіць, да нечага імкнуцца, інакш колькі грошай ні дай, усё можа сысці ў нікуды. А гэта адукацыя, новыя тэхналогіі — без іх развіцця не будзе. Чым больш мы людзей раскруцім, тым хутчэй наша эканоміка стане моцнай.



Галіна ТАРАН знайшла сваё прызванне ў сырнай справе.

МЕНАВІТА такія мерапрыемствы прымушаюць людзей рухацца і не сядзець на месцы, лічыць **старшыня Быхаўскага райсавета дэпутатаў Нэла ШУНЬКІНА.** А яшчэ змагацца і канкурыраваць, бо нецікавы праект ніколі не будзе мець шанцаў на поспех.

> Гэтым разам у Быхаве наогул закранулі не зусім тыповую тэму, звязаную з крэатыўнай эканомікай самазанятасці моладзі.



Пачапоўская школа ўжо зарабляе грошы на сваім праекце.

— Зараз шалі вагаў зрушваюцца ў бок не індустрыяльнага развіцця, а інтэлектуальнага, — кажа **дырэктар мясцовага фонду развіцця тэрыторый Быхаўскага раёна Раман МЕЛЬНІКАЎ.** — Крэатыўную эканоміку можна разглядаць як філасофію, гэта прадпрымальніцтва, заснаванае на творчасці. Творчая моладзь пакуль з'язджае з сельскай мясцовасці, бо тут адсутнічаюць умовы для развіцця іх здольнасцяў, нельга зарабіць на іх. Даследчыкі прыйшлі да высновы, што крэатыўных людзей хапае ў раёне, але грошы на гэтым робяць адзінкі. Патрэбны спецыялісты, якія дапамогуць моладзі знайсці сябе, новыя праекты, на прыкладзе якіх будзем адукоўваць маладых. Нам неабходна школа трэнерства, дзе будзем вучыць людзей, як развіваць патэнцыял у сферы бізнесу, цэнтр дзіцячай анімацыі, дзе з маленства будзе выпрацоўвацца жаданне тварыць, арт-студыя дамашняга дызайну, якая дапаможа жыхарам займацца рамонтамі, студыя тэатральнай анімацыі, дзе навучаць акцёрскаму майстэрству і гастрольнай дзейнасці, школа IT-праграмавання, каб моладзь магла самастойна распрацоўваць сайты, ствараць інтэрнэт-старонкі, прасоўваць сябе і сваю справу.

— Вельмі важна зацікавіць людзей развівацца ў гэтым кірунку, — салідарны з ім Сяргей Тарасюк. — З тых пяці раёнаў Магілёўскай вобласці, якія шчыльна з намі працуюць, знойдзецца чалавек 150, якія маглі б рэалізавацца ў гэтай сферы. З іх асноўны даход ад гэтай дзейнасці пакуль маюць 15—20 чалавек. На 80 тысяч насельніцтва гэтых раёнаў вельмі малая лічба. Таму наша задача — неяк падштурхнуць людзей, прымусіць іх пачаць дзейнічаць. Каб у выніку яны змаглі атрымліваць годны заробак. Толькі пасля гэтага мы смела зможам размаўляць пра сіліконавыя даліны.




З 21 раёна Магілёўскай вобласці ўжо пяць актыўна развіваюць праектную дзейнасць.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
zigulya@zviazda.by

ДЗЕЛАВАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

# НОВАЕ МЕСЦА ПУСТЫМ НЕ БЫВАЕ

**Сёлета ў вёсцы Шамятоўка Кобрынскага раёна запрацаваў цэх па вытворчасці рыбнай прадукцыі, які належыць прадпрыемству «ЮдзісІнвест».**

Чатыры гады таму маладыя кобрынскі бізнесмен Дзмітрый Карасюк разам з таварышамі стварылі невялікае прадпрыемства па перапрацоўцы рыбы ў горадзе. А калі справы пайшлі ўгору, адчулі, што настаў час пашыраць вытворчасць. Пачалі шукаць памяшканне, якое можна было б пераабсталяваць пад цэх. Многія аб'екты пераглядзелі ў найбліжэйшых ад горада вёсках, але прымальны варыянт усё не знаходзіўся. Тады ў райвыканкаме падказалі прыгледзецца да былой калгаснай канторы ў Шамятоўцы. Хоць размешчана яна далекавата ад райцэнтра, за 26 кіламетраў, але будынак прадалі за адну базавую велічыню — з умовай стварэння не менш як трох рабочых месцаў.



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

> У перыяд з 2015 года толькі суб'ектамі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва раёна створана больш за дзве тысячы рабочых месцаў.

За паўгода новы гаспадар прывёў пабудову ў парадак, зрабіў неабходны рамонт, абсталяваў цэх. І вось ужо вясной на работу былі прынятыя людзі, і не тры, а 20 чалавек. На прадпрыемстве выпускаюць рыбныя прэсервы розных відаў. Нядаўна асвоілі такую навінку, як філе селядца ў сырнай заліўцы. Селядца ў сырнай «шубе» пакуль не выпускае ніхто ў нашай краіне, так што спадзяюцца, што з рэалізацыяй праблем не будзе. Яшчэ на прадпрыемстве плануюць запусціць вытворчасць нестандартнай закускі — каўбасак з сёмгі. Усяго ў «ЮдзісІнвест» зараз зарэгістраваныя тры ўласныя гандлёвыя маркі і дзесяць відаў фасоўкі прадукцыі. Тут ужо будуюць планы па адкрыцці другога і трэцяга цэхаў. Значыць, паявяцца новыя рабочыя месцы.

**Загадчыца сектара аддзела эканомікі Кобрынскага райвыканкама Ірына БРЫНЧУК** гаворыць, што правільны выбар пляцоўкі для новай вытворчасці становіцца важным складнікам для любога пачаткоўца ў бізнесе. Аб гэтым сведчыць і прыклад прадпрыемства «ЮдзісІнвест». У райвыканкаме, дарэчы, сфарміраваная адзіная база маёмасці, якая не выкарыстоўваецца, — яе прапаноўваюць для продажу і здачы ў арэнду суб'ектам малога і сярэдняга бізнесу. Спіс пастаянна абнаўляецца, зараз у ім значыцца 115 аб'ектаў нерухомасці. Прадпрымальнікам прапануюць 35 перспектыўных, у тым ліку індустрыяльных, пляцовак для будаўніцтва вытворчых і невытворчых аб'ектаў, рэалізацыі інвестыцыйных праектаў на тэрыторыі раёна.

Паводле слоў Ірыны Брынчук, у перыяд з 2015 года толькі суб'ектамі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва раёна створана больш за дзве тысячы рабочых месцаў. У гэтым шэрагу не апошнім з'яўляецца прадпрыемства «ВЕЛПАК-Кобрын». Яно пасяхова працуе ў раённым цэнтры некалькі гадоў. Упакоўку з гафракардону тут заказваюць прадпрыемствы хімічнай і медыцынскай прамысловасці, а таксама харчовай і абутковай сферы. Экалагічныя і зручныя скрыні цяпер запатрабаваныя ў любой вытворчасці. Дык вось, зусім нядаўна была адкрыта другая лінія па выпуску кардону, работу атрымалі 46 чалавек.

Па колькасці новых рабочых месцаў апошнім часам лідзіруюць швейнікі. Больш за тры дзясяткі кабрынчан змаглі працаўладкавацца на новых вытворчасцях прадпрыемстваў «Скай-Арт» і «Скач-Арт». Цікавую, зусім новую для нашай краіны справу асвоілі швейнікі ТАА «Фабрыка «Модны горад». Яны выпускаюць джынсавае адзенне — каля паўсотні розных мадэляў.

Пляцоўку для цэхаў бізнесменам таксама падабраў райвыканкам. Ёй стаў адміністрацыйны будынак па вуліцы Дзяржынскага, размешчаны фактычна ў цэнтры горада. Памяшканне перадалі фірме ў бязвыплатнае карыстанне на тры гады з умовай стварэння новых рабочых месцаў. У вельмі сціслыя тэрміны прадпрымальнік зрабіў рамонт, завёз швейныя машынкі і іншае абсталяванне. І вось ужо 40 чалавек працаўладкаваныя на новай фабрыцы.

За паўгода прадпрыемства Алега Кудзіна давяло выпуск прадукцыі да дзвюх тысяч адзінак. Адкрыты фірменны магазін у Кобрыне. Дагавор на рэалізацыю заключылі з некаторымі іншымі швейнікамі, напрыклад Пінскай трыкатажнай фабрыкай. Спачатку тканіну для джынсаў куплялі ў Турцыі, потым у Пакістане, а цяпер кантракт на пастаўку падпісалі з Аршанскім ільнокамбінатам. Відаць, ужо можна гаварыць пра джынсы цалкам айчыннай вытворчасці.

Далей у планах «Моднага горада» пашыў вырабаў з норкавых і пясцовых шкурак па грэчаскай тэхналогіі, развіццё гандлю ўласнай прадукцыяй у сваёй краіне і павелічэнне экспарту ў Расію. Ну а для гэтага, як вядома, спатрэбяцца новыя штатныя адзінкі.

Прыклады такой дзелавой ініцыятывы, аб якіх расказвалася вышэй, выглядаюць вельмі пазітыўна і абнадзейваюць. Сюды ж можна аднесці і прадпрыемства «БелТрактары» ў вёсцы Пескі, дзе арганізавана зборачная вытворчасць малагабарытнай тэхнікі для сельскай гаспадаркі і створана адпаведна 48 рабочых месцаў. І хоць, паводле даных статыстыкі раёна, у структуры відаў дзейнасці па-ранейшаму пераважае аптовы і розпічны гандаль, апошнім часам усё ж намецілася тэндэнцыя да зніжэння яго долі. Бо адкрываць і развіваць сваю справу ў краіне становіцца прасцей. Павінна зменшыцца колькасць праверак, заканадаўства перажывае лібералізацыю.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
yackevich@zviazda.by
*Кобрынскі раён.*

**Сяргей ДЗЕНІСЮК, начальнік аддзела эканомікі Кобрынскага райвыканкама:**

— Як сведчаць вынікі мінулага года, Кобрынскі раён заняў трэцяе месца ў вобласці па колькасці арганізацый малога і сярэдняга прадпрымальніцтва пасля Брэста і Баранавічаў і другое месца — па аб'ёме прамысловай вытворчасці такімі суб'ектамі. Паспрыяць названаму працэсу павінна і новая структура, зарэгістраваная летась, — цэнтр падтрымкі прадпрымальніцтва — прыватная ўстанова адукацыі «Вучэбны цэнтр «Усенавуч».

На апошнім пасяджэнні Брэсцкага аблвыканкама **старшыня абласнога камітэта эканомікі Міхаіл БАЦЭНКА** агучыў такія лічбы:

— У студзені—верасні гэтага года ў рэгіёне створана 560 новых арганізацый мікра- і малога бізнесу. У тым ліку зарэгістравана 91 прамысловае прадпрыемства, 45 з іх ужо прыступілі да выпуску прадукцыі. Па гэтых паказчыках Брэстчына ўваходзіць у тройку лідараў пасля Мінска і Мінскай вобласці. Паступленні ў бюджэт ад бізнесу ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года выраслі на 4,2 працэнта, на 30,5 працэнта павялічыўся і аб'ём экспарту.

КАРЦІНКІ З ГЛЫБІНКІ

## Час для адпачынку

Для шэрагу прафесій у аграрным сектары сярэдзіна восені — гэта час, калі, нарэшце, можна адпачыць. Якую дапамогу пры гэтым можна атрымаць ад працоўных калектываў, **«Драгічынскі веснік»** спытаў у старшыні раённага аб'яднання прафсаюзаў Анатоля Спосаба. Ён адказаў, што практычна ва ўсіх калектыўных дагаворах ёсць пункты, якія прадугледжваюць матэрыяльную дапамогу на адпачынак і аздараўленне, і адзін раз у год чалавек можа ёю скарыстацца. Гэта — дадатковая выплата да зарплаты, частковая ці поўная кампенсацыя кошту санаторнай пуцёўкі. Асабліва змястоўнымі ў гэтым плане з'яўляюцца калектыўныя дамовы СВК «Асавецкі», ПМК-8, драгічынскай ЖКГ, ААТ «Экзон» і іншых прадпрыемстваў і арганізацый. Ён параіў звярнуць увагу на санаторыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Гэта магчымасць адпачыць у маляўнічых кутках Беларусі побач з прыродай.

## Алё, шукаем таленты!

Абласны этап рэспубліканскага фестывалю «Нашы таленты табе, Беларусь!» стартаваў з мінскага Палаца культуры ветэранаў. Да канца лістапада конкурсныя праграмы пройдуць у кожным абласным цэнтры, пра што паведамляе газета **«Патрыёт»** Ушацкага раёна. Конкурс праводзіцца сярод прафсаюзных і ведамасных клубных устаноў. Падчас канцэрта прадстаўляюцца тэматычныя праграмы, якія ўключаюць выступленні найлепшых калектываў і выканаўцаў. Фінал конкурсу адбудзецца 21 снежня сярод сямі самых моцных прэтэндэнтаў. Начальнік галоўнага ўпраўлення па культуры і грамадскай рабоце апарату Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Глеб Лапіцкі адзначыў: «У прафсаюзных і ведамасных клубных установах, як правіла, засяроджваецца ўсё культурнае і творчае жыццё калектываў прадпрыемстваў. Людзі прыходзяць сюды, каб адпачыць пасля працоўнага дня, паказаць свае таленты. Таму вельмі важна развіваць гэты кірунак, каб кожны чалавек мог праявіць сябе не толькі ў працы, але і ў творчасці, бо творчасць працоўных калектываў — гэта душа беларускага народа».

## Прафесійнае свята

Дзень аўтамабілістаў і дарожнікаў адзначылі ў мінулую нядзелю. З гэтай нагоды карэспандэнт газеты **«Кліч Радзімы»** Шаркаўшчынскага раёна пабываў у дарожным рамонтна-будаўнічым упраўленні №131. Асноўная спецыфіка філіяла — капітальны рамонт і ўтрыманне дарог. Работнікі службы абавязаны падтрымліваць у належным стане пад'язныя шляхі да кожнага, нават самага малазаселенага пункта. Зімой асабліва важна своечасова пасыпаць дарогі ці пачысціць іх ад снежных сумётаў. Узначальвае ДРБУ №131 Вячаслаў Гарбузаў, дэпутат раённага Савета. «Гэты год для дарожнікаў выдаўся напружаны, але разам з тым і нядрэнны, — лічыць ён. — На жаль, сёлета ў нашым раёне быў толькі адзін аб'ект, дзе працавалі работнікі прадпрыемства. Гэта бягучы рамонт аўтадарогі Апанасенкі—Лужкі—Гваздова. Каля аграгарадка Германавічы ў чэрвені мы адрамантавалі ўчастак дарогі з асфальтабетонным пакрыццём працягласцю 2 кіламетры. Працавалі таксама на будаўніцтве пад'язных шляхоў да будучага металургічнага завода ў Мёрах, на добраўпарадкаванні вуліц у гарадскім пасёлку Копысь Аршанскага раёна, займаліся рамонтам дваровых тэрыторый у Полацку да Дня беларускага пісьменства».

**Надзея АНІСОВІЧ.**
anisovich@zviazda.by

# ГЛЯНЕМ У ДВАРЫ — СКАЖАМ, ЯКІЯ ГАСПАДАРЫ

## Сацыяльныя сеткі ў дапамогу

Сёння Ірына Піскун можа даць разгорнутыя парады: з чаго пачынаць справу і як шукаць падыходы да людзей. Досведам дзеліцца з задавальненнем і лічыць, што нешта аналагічнае можна зрабіць у кожным двары. Між тым з 11 дамоў, якія аб'ядноўвае двор — чатыры кааператыўныя, астатнія на абслугоўванні РЭУ. Гэта не стала перашкодай у справе добраўпарадкавання. Ідэі, якія прыносяць агульную карысць, аб'ядноўваюць. Такім чынам і нарадзілася сапраўды народная канцэпцыя двара з гульнявымі зонамі.

> Сацыяльныя сеткі і папулярныя месенджары зрабілі гэтую справу максімальна празрыстай. Актывісты правялі інфармацыйную кампанію ў Viber, дзе людзі аб'ядналіся ў групу і сталі ўдзельнічаць у распрацоўцы праекта. У супольнасць уступілі і падлеткі, якія падзяліліся з дарослымі сваімі марамі.

І вось тут да справы падключыліся камунальнікі. Іх на кані ніяк не аб'едзеш. Бо ў любых ініцыятыўных людзей можа сур'ёзна пагоршыцца настрой, калі яны спатыкнуцца аб кабель ці каналізацыю, закапаныя па схемах, якія ведаюць толькі спецыялісты адпаведных службаў. І таму супрацоўніцтва, якое перарасло ў пяшчотную дружбу, было непазбежнае.

«Не можаце даць грошай — дапамагайце парадамі і тэхнікай!» — звярнуліся праз два месяцы жыхары двара да прадстаўнікоў ЖКГ. І тыя адгукнуліся. Прычым, настолькі актыўна, што цяпер самі сочаць за перапіскай у групе ў Viber. Дзякуючы гэтаму ведаюць, якія ў насельніцтва ўзнікаюць да іх прэтэнзіі.

— Да гонару кіраўніцтва КЖРЭУП «Савецкае», яны, калі зразумелі маштаб рэканструкцыі тэрыторыі, на які мы замахнуліся, самі зацікавіліся, — адзначае Ірына Піскун. — А ёсць зацікаўленасць — з'явяцца і магчымасці.

— Распараджэннем адміністрацыі Савецкага раёна Гомеля за гэтым дваром замацавалі два прадпрыемствы: домабудаўнічы камбінат і КЖРЭУП «Савецкае», — расказвае **Міхаіл ПРУС, які ўзначальвае апошняе прадпрыемства і з'яўляецца дэпутатам Гомельскага гарсавета.** — Таму і дапамагаем усім, чым магчыма. У нас усе схемы электрасетак, цеплясетак, каналізацыі і г. д. Узгадняем, як усё зрабіць без памылак. Напрыклад, нельга валейбольную пляцоўку ўсталёўваць побач са скрынямі для смецця. Дарэчы, апошнія мы перанеслі на іншы бок дваровай тэрыторыі. 18 разоў выдзялялі тэхніку і супрацоўнікаў. Для ўладкавання спартыўных аб'ектаў знялі 40 см грунту. Завезлі пясок і адсеў для футбольнай пляцоўкі. Жыхары купілі ўсе матэрыялы для варот, а супрацоўнікі КЖРЭУП іх зварылі. Сумесна ўстанавілі і пафарбавалі. Нам гэта таксама вельмі выгадна. Мы такім чынам развіваем ініцыятыву жыльцоў. Прынамсі, і дэпутаты гарсавета нас актыўна падтрымалі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС»)


Экскурсія дэпутатаў.

## Новы экскурсійны маршрут

Цяпер цугам у чароўны двор пайшлі... экскурсіі. Удзельнікам семінараў і калегій пінжакі некалькі перашкаджаюць катацца на горках ці арэлях, аднак яны адкрыта зайздросцяць дзецям, якія растуць у гэтым двары.

— Мы запрашалі кіраўнікоў і старшынь камітэтаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання з кожнага РЭУ, каб паглядзелі, што можна зрабіць пры наяўнасці ініцыятыўных людзей, — адзначае Міхаіл Юльевіч. — Цяпер ёсць яшчэ тры двары ў Савецкім раёне, дзе з'явіліся дзіцячыя пляцоўкі за кошт жыхароў. Старшыня Гомельскага гарсавета Іван Барадзінчык паставіў задачу кожнаму дэпутату ў сваіх выбарчых акругах знайсці ініцыятыўных людзей і выбраць двор, дзе можна зрабіць не горш. Некаторыя з дэпутатаў загарэліся такой ідэяй.

Яшчэ адна **актывістка і член КТГС «Сонечны» Таццяна БАРАВІК** дадае, што, калі вынікі работы жыхароў убачылі прадстаўнікі заканадаўчай улады розных узроўняў, то самі выказалі прапановы аб дапамозе:

— Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Павел Ждановіч знайшоў для нашага гарадка блакітную ёлку, якая да Каляд будзе дастаўлена ў наш двор. Дэпутат Гомельскага абласнога Савета Аляксандр Ганчароў — спонсара для ўкладкі новых тратуарных дарожак і падрыхтоўкі пляцоўкі для будучага спартыўна-гульнявога комплексу. Дэпутат Гомельскага гарсавета Леанід Кузняцоў — высадкі для азелянення тэрыторыі.

## Майстры на ўсю галаву

А яшчэ, дзеліцца ўскоснымі вынікамі працэсу будаўніцтва дзіцячай пляцоўкі Ірына Піскун, падчас агульнага будаўніцтва адбылося амаль неверагоднае: мужчыны-бацькі падкасалі рукавы і перасталі саромецца тых навыкаў, якімі валодаюць. Аказалася, сярод жыхароў ёсць і дызайнеры, і архітэктары, і мастакі... Разнастайныя справы знайшліся для адважных татаў, якія на сваім прыкладзе не пабаяліся паказаць, хто ў двары гаспадар.

Калі атрымалася ўсталяваць першыя арэлі, адсвяткавалі проста ў двары: салодкім сталом і анімацыяй. Паўтаралі і ўдасканальвалі вопыт яшчэ некалькі разоў за лета. Такім чынам абноўленая дваровая тэрыторыя ператварылася ў вялізную канцэртную пляцоўку.

— Для кожнага чалавека вельмі важна, дзе ён нарадзіўся, дзе вучыўся, з кім ажаніўся і як сустрэне сваю старасць, — нагадвае Ірына Піскун. — Час дзяцінства моцна ўплывае на тое, якая асоба вырасце. З такога двара не выйдзе дрэнны чалавек. Не страшна выпусціць малога ў двор — ён нікуды не пойдзе, бо яму ёсць чым тут заняцца.

Цяпер суседзі да жыццёвай прасторы ставяцца па-гаспадарску: сочаць за тым, каб абсталяванне не прастойвала, але ў той жа час выкарыстоўвалася асцярожна. Бось і дырэктар КЖРЭУП «Савецкае» Міхаіл Прус сцвярджае, што стаўленне жыхароў да таго, што зроблена сваімі рукамі і за свой кошт, значна змянілася:

— У гэтым двары не будуць нічога ламаць. А, калі нехта чужы зазірне, яго спытаюць: адкуль і навошта.

> **Дзіцячы гарадок** — *гэта вялікая тэрыторыя з чатырох тэматычных пляцовак. Для самых маленькіх уладкаваны пясочніцы з вечкамі, для старэйшых — арэлі і турнікі. Падлеткі могуць размінацца на футбольным і валейбольным палях. Пры жаданні любую з пляцовак можна трансфармаваць ці дапоўніць. Ну а для дарослых ёсць альтанкі і шахматныя сталы.*

## Узмах крыла — як у арла

— Нам пашанцавала, — сцвярджае Ірына Піскун. — Міхаіл Юльевіч трапіў да нас праз два месяцы пасля пачатку збору сродкаў. Ён хутка ацаніў тое, што мы самі зрабілі, і вельмі дапамог потым. Пайшоў «узмах крыла, як у арла». Пафарбавалі ўваходныя групы васьмі дамоў. Павесілі новыя дошкі аб'яў, паставілі сметніцы каля кожнага пад'езда. Калі вы самі папрацавалі добра, вам абавязкова дапамогуць, а калі будзеце толькі патрабаваць, нічога не атрымаецца. Каб табе паверылі, свае намаганні трэба прыкласці.

Сёлета наўрад ці атрымаецца ажыццявіць усё задуманае. Бо планы ў актывістаў напалеонаўскія. Тут замахнуліся на будаўніцтва не проста гульнявога, а спартыўна-забаўляльнага гарадка. Задавальненне гэта не з танных, самы просты комплекс каштуе каля 4,5 тысячы рублёў. А з праектам, сертыфікацыяй, усталёўкай — больш за 7 тысяч.

— Такую суму, здзяйсняючы пакватэрныя абыходы, нам нават за год не пацягнуць, — разважае Ірына. — Таму папрасілі камунальнікаў уключыць гэтыя выдаткі асобным радком у «жыроўку». Сума з кожнай кватэры атрымаецца такім чынам невялікая: па адным рублі. За некалькі месяцаў, максімум за паўгода патрэбныя грошы можна было б сабраць. Аднак праблема ў тым, што такі плацеж не прапускае сістэма АРІП. Значыць, трэба ўносіць у сістэму змены. Няхай бы ўлады ініцыявалі гэтыя змены, прапанавалі іх адпаведным міністэрствам.

> Тым часам на ўжо створаней пляцоўцы гуляць дазваляецца ўсім дзецям. І тым, чые бацькі плацілі грошы,і тым, хто пакуль разважае. Ніхто нікога не папракае, але на тое, што сумленне прачнецца, многія спадзяюцца.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
iost@zviazda.by


Такі двор быў.


Такі двор стаў.

ДОБРАЯ СПРАВА

## «Адсюль пагражаць мы будзем шведу...»

**У Слаўгарадскім раёне адкрыўся ўнікальны музей пад адкрытым небам — імітацыя бою рускіх са шведамі пры Лясной у 1708 годзе.**



На плошчы амаль гектар раскінуліся рэдуты, гарматы, абозы, палаткі, невялічкі храм і нават пластыкавае войска дзвюх армій. Ініцыятыва рэалізавана ў рамках праекта ЕС—ПРААН «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь». Яе аўтарамі сталі Лапаціцкі сельсавет і цэнтралізаваная сетка публічных бібліятэк Слаўгарадскага раёна.

— Можна лічыць, што ўдзел у нашай рабоце прымалі некалькі раёнаў, — падзяліўся падрабязнасцямі стварэння музея **старшыня Лапаціцкага сельсавета Сцяпан БАЙЦОЎ.** — Мы сваімі сіламі будавалі рэдуты, майстар з Горак зрабіў нам драўляныя гарматы, яшчэ адзін умелец з Краснаполля стварыў старадаўнюю зброю. Атрымалася нядрэнна.

Цікава, што нават твары салдат пластыкавага войска іменныя — яны зроблены з фотаздымкаў жыхароў Слаўгарадскага раёна. Прыём вельмі правільны, бо кожнаму захочацца паказаць сябе ў эпахальным паядынку сябрам і знаёмым. А гэта як мінімум некалькі вельмі чаканых тут турыстаў.

Адкрыццё музея стала пачаткам яшчэ і міжрэгіянальнага фестывалю «Лясная — месца воінскай славы». Сярод ганаровых гасцей на ім прысутнічала галоўны спецыяліст пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Яўгенія Субоціна. Перад гасцямі выступілі байцы клуба ваенна-гістарычнай рэканструкцыі «Усходняя застава», а таксама з анімацыйнай праграмай супрацоўнікі ўстаноў культуры Слаўгарадскага раёна.

— Гэты музей — добры прыклад ініцыятыўнага і крэатыўнага падыходу ў развіцці турыстычнага і экскурсійнага патэнцыялу рэгіёна, паляпшэнні інфраструктуры, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці Слаўгарадчыны ў цэлым, — адзначалася на прэзентацыі ініцыятывы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
zigulya@zviazda.by

## Кароткі нумар 112 — на вышыні

**Самая высокая прэзентацыя адзінага нумару выкліку экстранных службаў 112 у Беларусі знаходзіцца ў Жодзіне.**

Як паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях, мясцовыя гарадскі аддзел па надзвычайных сітуацыях і ТЭЦ выбралі магутны і эфектыўны спосаб перадачы жыхарам горада і нанеслі тэкст «МНС 112» на трубе вышынёй 125 метраў.

Ратавальнікі нагадалі, што на тэрыторыі Беларусі з чэрвеня 2013 года дзейнічае дадатковы нумар адзінай дзяжурна-дыспетчарскай службы — 112. Пазваніўшы па ім, можна паведаміць пра любое надзвычайнае здарэнне — гарантаваную дапамогу акажуць ва ўсіх экстрэмальных сітуацыях.

Нагадаем таксама, што па ініцыятыве ратавальнікаў у шэрагу гарадоў на фасадах будынкаў цягам апошняга часу з'явіліся графіці супрацьпажарнай тэматыкі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
rs@zviazda.by

## 3 флікерам — бясплатна

**У Гомелі падчас асенніх канікул па 7 лістапада школьнікі малодшых класаў змогуць бясплатна пракаціцца ў маршрутках. Праўда, пры гэтым ім трэба паказаць наяўнасць святлоадбівальных элементаў.**

Афіцыйны прадстаўнік упраўлення ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама Дар'я Смаляк гаворыць, што такое рашэнне было прынята на сустрэчы з перавозчыкамі экспрэс-таксі, якая прайшла ў ААТ «Гомельаблаўтатранс». Ініцыятыву ДАІ правесці акцыю «Флікер замест праязнога» аднагалосна падтрымалі ўсе перавозчыкі абласнога цэнтра. Асноўная мэта прафілактычнага мерапрыемства — яшчэ раз нагадаць пра важнасць выкарыстання святлоадбівальных элементаў у цёмны час сутак. Між тым у гомельскіх школах і дзіцячых садках святлоадбівальныя элементы супрацоўнікі ДАІ раздаюць дзецям бясплатна падчас адкрытых урокаў па вывучэнні правілаў дарожнага руху.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
iost@zviazda.by

# ПРЫЙШОЎ ЧАС ДЗЕЙНІЧАЦЬ

## Кавалак дарогі, дзіцячую і парковачную пляцоўкі ўдалося зрабіць у Клейніках талакой

**Клейніцкі сельсавет прыгарадны, фактычна ён мяжуе з гарадской рысай Брэста, але ён яшчэ і памежны, па тэрыторыі праходзіць дзесяць кіламетраў дзяржаўнай мяжы з Польшчай. Характэрнай асаблівасцю можна назваць і ландшафны заказнік «Бугскі»— мясціны тут незвычайнай прыгажосці. І, як высветлілася, не толькі мясціны. Напрыклад, дзве прыгажуні Вольга Неўдах і Юлія Скалковіч, якія ў розныя гады станавіліся пераможцамі конкурсу «Міс Беларусь» і якіх называлі брастаўчанкамі, насамрэч нарадзіліся і жывуць у Клейніках.**



— Можна яшчэ шмат чаго пералічваць, — гаворыць **старшыня Клейніцкага сельскага Савета дэпутатаў Алена МЕЛЬНІК**. — У нас працякае дзве ракі — Буг і Лясная, ёсць помнікі гісторыі і культуры, на тэрыторыі размяшчаюцца памежная застава і мытны пункт. Усё гэта абавязвае падтрымліваць парадак на ўзроўні і займацца добраўпарадкаваннем з прыцягненнем усіх магчымых сіл і сродкаў. Якіх?

### Для самых маленькіх

Новы квартал жылой забудовы вырас за апошнія гады прыкладна за кіламетр ад асноўных вуліц аграгарадка. Там жыллё ўзвялі ў асноўным маладыя сем'і, сярод якіх нямала шматдзетных. А пагуляць з малымі, акрамя свайго двара, не было дзе. Каб трапіць на бліжэйшую дзіцячую пляцоўку, маці з каляскай трэба было прайсці кіламетр, а то і болей. Гэта пытанне даўно абмяркоўвалася ў асяроддзі навасёлаў альбо маладых матуль — дзе-небудзь у паліклініцы, паміж суседзямі. І вось аднойчы старшыня сельвыканкама ўключыла яго ў парадак дня на сельскім сходзе. Такім чынам прапанова атрымала афіцыйную падтрымку. Стварылі ініцыятыўную групу, актывісты прайшлі па дамах, сабралі грошы. Атрымалася 10 мільёнаў «яшчэ тых» рублёў. За іх набылі некаторыя будаўнічыя матэрыялы. 35 мільёнаў выдзеліў сельвыканкам. За гэтыя сродкі закупілі сертыфікаванае абсталяванне і аплацілі яго мантаж.

На расчыстку і добраўпарадкаванне тэрыторыі пад будучую пляцоўку выходзіла большасць жыхароў квартала. І цяпер усе задаволеныя тым, што з малымі не трэба дабірацца ў цэнтр вёскі, каб дзеці пакаталіся на арэлях ды пакоўзаліся з горкі.

### 590 метраў вуліцы

Вуліца Пагранічная таксама з'явілася ў выніку разрастання аграгарадка Клейнікі. Жыхары дамоў — у асноўным маладыя людзі. Таму яны не ленаваліся пісаць ды звяртацца ў розныя інстанцыі з просьбай адрамантаваць, падсыпаць вуліцу. Але час ішоў, фінансавання не выдзялялі, спасылаючыся на адсутнасць сродкаў. А людзі тым часам, асабліва падчас веснавой ці асенняй паводкі, вымушаныя былі хадзіць толькі ў гумовых ботах. І вось аднойчы, у канцы 2015 года, жыхары сабраліся чарговы раз з кіраўніком мясцовай улады і вырашылі, што прыйшоў час дзейнічаць, а не толькі прасіць. Для пачатку сабралі грошы, атрымалася 40 мільёнаў (недэнамінаваных). За іх купілі другасную сыравіну. Потым за справу ўзяліся дарожнікі, да якіх звярталіся і раней. На гэты раз ДРБУ-138 правяло падсыпку і грэйдзіраванне 590 метраў дарогі, затраціўшы яшчэ 100 мільёнаў рублёў. Цяпер хадзіць па вуліцы стала магчыма ў любое надвор'е.

**Што цікава, жыхары Пагранічнай да сваёй дарогі цяпер ставяцца не проста беражліва, а нават трапятліва. Самі сочаць за тым, каб па дарозе не хадзілі вялікагрузныя машыны.**

Калі такое заўважаюць, адразу інфармуюць кампетэнтныя службы. Паведамляюць, калі здараюцца хоць невялікія падмывы ўчастка дарогі ў выніку ападкаў. Калі толькі хто пачынае праводзіць спецыфічныя работы, адразу паступае званок у сельсавет, грамада Пагранічнай вуліцы цікавіцца: ці мае дазвол на выкопванне траншэі арганізацыя альбо прыватная асоба, што яго распачала? Калі ж дарожнікі праводзяць чарговую прафілактыку дарожнага пакрыцця, ім пакажуць нават на дробныя агрэхі. Адным словам, людзі адчулі сябе гаспадарамі і паводзяць сябе адпаведным чынам, што, на думку старшыні сельскага Савета, вельмі і вельмі радуе.

### Парковачныя месцы каля царквы

Так сталася, што цэнтральная плошча аграгарадка не раз станавілася месцам канфліктаў. Справа ў тым, што тут знаходзіцца школа мастацтваў з актавай залай, цэнтр карэкцыйна-развіваючых заняткаў і рэабілітацыі інвалідаў. Тут жа размешчаны канцавы прыпынак грамадскага транспарту. Здаралася, што бацькі, якія прыязджалі на канцэрт сваіх дзяцей у школу мастацтваў, і бацькі, што прывозілі родных у цэнтр інвалідаў, застаўлялі машынамі ўсю плошчу так, што аўтобус развярнуцца не мог. Тады адбываліся канфлікты з выклікам ДАІ, з размовамі на павышаных танах і высвятленнем адносін. І не было відаць выйсця, бо людзі не ведалі, куды падзець свае аўтамабілі, а грамадскаму транспарту, як вядома, нельга парушаць графік. І вось тады ў старшыні сельскага Савета нарадзілася ідэя агульнымі намаганнямі абсталяваць парковачную пляцоўку побач з царквой, якая ўзводзіцца. Названая пляцоўка крыху ўбаку ад плошчы, але на такой адлегласці, адкуль нескладана перайсці ў будынак нават з інвалідам, не кажучы ўжо пра здаровых.

— Такім чынам мы вырашылі глабальную для Клейнікаў праблему, — гаворыць Алена Мельнік.

Да гэтай работы мясцовая ўлада прыцягнула спонсараў, прыватныя і дзяржаўныя структуры, якія працуюць на тэрыторыі сельсавета, — яны прафінансавалі важны для вёскі аб'ект. А мясцовыя жыхары — і сталыя, і моладзь — выйшлі на суботнік і дапамаглі добраўпарадкаваць новую парковачную пляцоўку.

### За чысціню прыбярэжных палос

Як гаварылася ў самым пачатку, заказнік «Бугскі» ўтвараюць вельмі прыгожыя мясціны. А паколькі горад побач, сюды прыязджае шмат адпачывальнікаў. Вядома, як адпачывае на прыродзе наш суайчыннік: пакідае шмат смецця. У барацьбе з ім ужо склалася цэлая сістэма. Алена Пятроўна гаворыць, што ёсць людзі, якія любяць сваю раку, любяць прыроду, яны сталі касцяком актыву па падтрыманні чысціні: такія, напрыклад, як прадпрымальнік Аляксандр Падбярэзскі, дэпутат сельскага Савета Наталля Прышла. Цяпер нават не трэба аб'яўляць вялікіх суботнікаў. Людзі выходзяць маленькімі групамі і прыводзяць у парадак той участак ракі, які пацярпеў ад «набегу» адпачывальнікаў. Жыхары вуліцы Пагранічнай, пра якіх гаварылася вышэй, актыўна выходзяць на прыборку Лясной. У Костычах гэта робяць Ірына Пазняк і староста вёскі Ірына Дзенісюк, а таксама Антаніна Мацукевіч, у Песках — староста Надзея Карпуза. «Ды ў кожнай вёсцы можна знайсці чалавека, які клапоціцца пра грамадскі інтарэс. Важна знайсці такога чалавека, — кажа старшыня сельскага Савета. — Вынік двухгадовай пастаяннай работы ў названым кірунку можна праілюстраваць такім прыкладам: калі ў 2015 годзе на сабранае смецце патрабавалася два прычэпы трактара, цяпер мы абыходзімся ўсяго 10 мяхамі».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
yackevich@zviazda.by



Жыхары Клейнікаў на суботніку.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**
Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**
**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by
**Газета надрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**
**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 31 кастрычніка 2017 года.**